PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://republika.pl/niva_bielastok/
niva_bielastok@poczta.onet.pl
niva_bielastok@skrzynka.pl

№ 40 (2421) Год XLVII | Беласток, 6 кастрычніка 2002 г. | Цана 2,00 зл.

Веру ў беларускі голас

Гутарка са старшынёю Беларускага саюза ў Рэчы Паспалітай Яўгенам ВАПАМ.

— Якія мэты ставіць перад сабой Беларускі выбарчы камітэт у Беластоку?

— Адсутнасць у дэмакратычных выбарах можа абазначаць слабасць, а зараз штораз больш спраў вырашаецца самакіраваннямі на мясцовым узроўні. І за нацыянальныя меншасці дзяржава з ахвотаю перадае сваю адказнасць органам мясцовага самакіравання.

У Беластоку Беларускага выбарчага камітэта не было даўно, але калі нашы камітэты ішлі да выбараў у іншых мясцовасцях і перамагалі, дык чаму ж аддаваць поле ў Беластоку? Беларускі выбарчы камітэт у Беластоку выставіць свае спіскі кандыдатаў у Гарадскую раду Беластока і ў Ваяводскі сеймік Падляшскага ваяводства. Мабыць паставім таксама кандыдата на прэзідэнта горада, бо нашы прыхільнікі павінны мець свой выбар, а не абмяжоўвацца да іншых палітычных спіскаў. Маем шмат людзей падрыхтаваных для працы ў самаўрадавых органах. У Беластоку пражывае найбольш беларусаў і лагічна, што менавіта тут Беларускі выбарчы камітэт павінен выступаць за іх справы.

Фота з АРХІВА

Калі ўсе гаворым пра сваю тоеснасць, то адной з яе праяваў з'яўляюцца выбары ў органы самакіравання. Часта думаем, што калі ў іншых спісках знойдзецца адна асоба, то яна нешта зробіць, аднак на практыцы сілу мае гурт, а не адзінкі. Калі хто балаціруецца з іншага спіска, той прымушаны рэалізаваць чужыя інтарэсы, якія наогул супярэчаць нашым. Хачу толькі ўзгадаць словы выказаныя старшынёй падляшскага СЛД Мечыславам Чарняўскім:

[працяг ☞ 2]

Фота ЗОСІ ЛЕМЕШ

Яновіч на сцэне

Сакрат Яновіч, вядомы беларускі празаік, 18 верасня выступіў у Бельску-Падляшскім у ролі драматурга. Акадэмічны тэатр з Віцебска паставіў у Бельскім доме культуры спектакль паводле яго п'есы „Арышт", прысвечаны гісторыі арышту беларускага дзеяча Браніслава Тарашкевіча.

Пастаўлена Віталем Баркоўскім (рэжысёр) трагікамедыя мае назву „От цо да" — што паказвае на каланіялізм, з якім меў (і мае) дачыненне беларускі народ. „От — беларускае слова, цо — польскае, да — рускае — паказваюць на праблему знаходжання Беларусі паміж захадам і ўсходам, а што за гэтым ідзе, — гаварыў Сакрат Яновіч, — на праблему выбару адпаведнага накірунку".

— Гісторыя напісання „Арышту" складаная, — гаворыць аўтар. — Усё пачалося даўно, амаль 30 гадоў таму, калі ў 1972 годзе выйшла кніжка Аляксандры Бергман „Rzecz o Bronisławie Taraszkiewiczu", якая „падбухторыла" мяне напісаць драму, пачаткова на аматарскую сцэну, — гаворыць Сакрат Яновіч, — а і практыка была. Праца ішла цяжка, — успамінае. — Шмат было версій. Вяртаўся я да драмы 20 гадоў, але не штодзень, — дадае з усмешкай. — Да паправак і большай працы змабілізавала мяне станоўчая ацэнка Яна Чыквіна, які пасля надрукавання п'есы ў „Тэрмапілах" сцвердзіў, што добра яна чытаецца. Тады паслаў драму ў Віцебскі тэатр з надзеяй, што спадабаецца, а можа і пабаяцца паставіць, але паставілі".

Першую прэм'еру ў мястэчку Глыбокае, беларуская публіка сустрэла бурнай авацыяй стоячы. 17 верасня трагікамедыя была пастаўлена ў Крынках, дзе прынялі яе таксама ветліва, а дзень пазней акцёры Віцебскага тэатра завіталі ў Бельск.

Выступалі, тым разам, перад маладой публікай — вучнямі бельскага белліцэя, патронам якога з'яўляецца галоўны герой драмы, Браніслаў Тарашкевіч. У гэты момант трэба падзякаваць і папракнуць арганізатараў. Падзякаваць за магчымасць паглядзець прафесійнае акцёрства, з якім рэдка сутыкаюцца вучні, у тым ліку бяльшчане. Папракнуць за тое, што сарганізавалі толькі адзін спектакль, а не тры, як у Гайнаўцы, дзе магла яе паглядзець крыху старэйшая публіка, больш зацікаўленая тэатральным мастацтвам.

Пачатак XX стагоддзя — час калі фарміраваўся светапогляд большасці беларусаў. Пётр Аношчанка — аўтар сцэнічнага афармлення і касцюмаў, прысутнасцю некалькіх прадметаў на сцэне паказаў трагізм сітуацыі. Фартэпіяна служыла за стол, труну, гармонік не даваў музыкі, абазначаў няволю, немагчымасць выдавання кніжак. У галоўнай ролі — Браніслава Тарашкевіча — выступіў Валянцін Салаўёў; роля камісара паліцыі прыпала Юрыю Цвірку, пракурорам быў Рыгор Шацька, следчым суддзёй — Генадзь Гайдук, а роля савецкага следчага прыпала Святаславу Страмовічу. На сцэне паявіліся таксама жанчыны. Тамара Скварцова ў ролі польскага дэтэктыва паказала вялікае акцёрскае майстэрства. У масавых сцэнах выступілі: Ірына Цішкевіч, Вольга Шчамялёва і Ангеліка Баркоўская.

Спектакль падабаўся бельскай публіцы, хаця пазней вучні прызнаваліся, што не разумелі некалькіх момантаў. Акцёры атрымалі бурныя апладысменты, найлепшую падзяку, як сказаў на канец Валянцін Салавёў, выканаўца ролі Браніслава Тарашкевіча.

На маё пытанне ці аўтар задаволены спектаклем, Сакрат Яновіч адказаў: „Здзіўлены, гэта больш чым урадаваны, бо жыццё Тарашкевіча — цэлая эпоха, мініяцюрны лёс усіх нас, лёс ад якога нельга ўцячы".

Паўліна ШАФРАН

Новыя пагранзаставы ў Дубічах і Міхалове ☞ 2

Аднак, найбольшая надзея ва ўзросце актыўнасці, звязаным з рынкам працы. Дарэмная гэта, аднак, надзея. Маёр Бацяняк прызнаецца:

— Прымем на працу адну, можа, дзве цывільныя асобы. Прыбіральшчыцу, можа, стоража...

Суверэнная краіна Беларусь ☞ 4

Вялікай палітычнай падзеяй у Беларусі была сустрэча Лукашэнкі 17 верасня з журналістамі ў прэзідэнцкай рэзідэнцыі. Хаця праходзіла яна ў прысутнасці вялікай колькасці падначаленых прэзідэнту работнікаў СМІ, аднак удзельнічалі ў ёй таксама журналісты, якіх цяжка было б назваць паклоннікамі прэзідэнта.

Выбарчая вера ў амнезію ☞ 4

Я разумею, што ўлада перад выбарамі мусіць паказвацца з як найлепшага боку, што верыць у бяспамяцтва грамадства на тэму яе былых дзеянняў або прыносіць абяцанні, якія з прычыны на тую быццам бы амнезію можна будзе размыць у гушчы бягучых праблем. Усё гэта — шыта грубай ніццю, а выбаршчык мае быццам бы дурня клеіць.

Юбілейны кангрэс ☞ 8

У „Доме дружбы" ў Варшаве адбыўся III Кангрэс Аб'яднання Польшча-Беларусь у дзесятую гадавіну яго дзейнасці. Праца з моладдзю гэта адна з найважнейшых задач Аб'яднання. Пачэснае месца займае тут Алімпіяда беларускай мовы. Адбываецца яна ўжо восем гадоў.

На Галавасека ў Шчытах ☞ 9

Каля брамы ў храм і на прыцаркоўным пляцы многа духоўных і свецкіх асоб са скарбонкамі, якія збіралі грошы на царкоўныя пабудовы. Пад цвінтарным мурам маладая цыганка на каленях, з тэкстам на картачцы; людзі на яе быццам не звярталі ўвагу. Каля званіцы некалькі сталоў з багатай культавай прапановай: іконкамі, крыжыкамі, кніжкамі...

З патрэбы сэрца ☞ 11

Нашы страусы, якіх мы назвалі Лявонам і Лявоніхай, паўгадовыя і прывезлі мы іх з-пад Беластока. На прыём страусаў рыхтаваліся мы два гады. Хатка ім, крытая саломай, каштавала больш за саміх страусаў. Маюць вялікую загараду, многа свабоды, маюць дзе купацца, адчуваюць сябе добра.

Беларусь — беларусы

Надзея ў заставе

Чарговыя дзве пагранзаставы будуць адкрыты на Беласточчыне: 11 кастрычніка ў Дубічах-Царкоўных, а 19 кастрычніка — у Міхалове. Мясцовыя ўлады спадзяюцца на прысутнасць на ўрачыстасці прадстаўнікоў цэнтральнай улады. Нявыключана, што міністра замежных спраў, а, можа, і самога прэм'ера. Пры нагодзе пабудовы і адкрыцця пагранзастаў, асабліва ў Дубічах, як і раней у Нараўцы, вярнулася справа заставы ў Пуньску, мясцовасці, населенай у значнай большасці літоўцамі. Як войт Пуньска, так і старшыня Саюза літоўцаў у Польшчы ўвесь час лічаць, што функцыянаванне пункта Памежнай стражы якраз у Пуньску між іншым парушае яе нацыянальную тканку. Ні на што здаліся пратэсты і просьбы перанесці пагранзаставу некалькі кіламетраў далей. Глухія на гэтыя пастулаты былі аднолькава як правы ўрад Ежы Бузка, так і цяперашні левы — Лешка Мілера (дарэчы: літоўцы ў самаўрадавых выбарах ідуць разам з СЛД; ці ўзамен за перасоўку пагранзаставы?).

Тым часам у беларускіх Дубічах-Царкоўных з заснавання пагранзаставы цешацца, прынамсі **войт**:

— няма праблемы з мяшаннем крыві, ніякага скрыгату на нацыянальным фоне...

— людзі цешацца, бо дзейнасць пагранзаставы гэта выключна карысці, якія жыхары Дубіч могуць мець, — падтаквае маёр Бацяняк з прэсавага бюро Падляшскага аддзела Памежнай стражы.

Якія карысці? Дубіцкі войт пералічвае:

— Будуць занятыя на працы ў пагранзаставе цывільныя асобы, жыхары з тэрыторыі нашае гміны, так, каб былі ўвесь час у распараджэнні. Пункт продажу можа расшырыць сваю дзейнасць. Школа можа мець дадатковыя датацыі звязаныя з магчымай адукацыяй у ёй дзяцей пагранічнікаў... На адно дзіця, якое вучыцца ў новай школе атрымліваем 5,5 тыс. зл. у год.

Як кажа маёр Бацяняк, у пагранзаставе ў Дубічах (як і ў Міхалове) мае працаваць чалавек па 30. Толькі некалькі пагранічнікаў прыедзе з сем'ямі. Рэшта — у асноўным маладыя службовыя асобы-кавалеры.

— Можа, знойдуць тут дзяўчат... Мабыць, пабольшыцца ў нас колькасць жыхароў... — марыць войт.

Аднак, найбольшая надзея ва ўзросце актыўнасці, звязаным з рынкам працы. Дарэмная гэта, аднак, надзея. Маёр Бацяняк прызнаецца:

— Прымем на працу адну, можа, дзве цывільныя асобы. Прыбіральшчыцу, можа, стоража.

Да таго гміна ўжо ўклала свае выдаткі звязаныя з пагранзаставай. Як кажа войт, „гміна дала сваё ў рамках супрацоўніцтва". Бясплатна перадала Памежнай стражы гектар зямлі пад будынак пагранзаставы і даклалася ў значнай частцы (таямніца, у як значнай) у будову шчыльнай каналізацыйнай сістэмы.

— Гэта — у рамках супрацоўніцтва, — усё падкрэслівае войт. — А на ўрачыстасць адкрыцця запрошаны прэм'ер.

Пункт Памежнай стражы ў Дубічах адкрываецца на два тыдні перад самаўрадавымі выбарамі (у Міхалове — тыдзень да выбараў).

— Прэм'ер, калі прыедзе, дык, мабыць, у Міхалова, — мяркуе маёр Бацяняк.

У Дубічах апошні візіт на самых высокіх прыступках улады адбыўся ў час улады Цімашэвіча, які ў прэзідэнцкую кампанію наведаў іх з кандыдатам у прэзідэнты Аляксандрам Кваснеўскім. Абодва пазіралі на абязлюднелыя дамы вакол мясцовага вадасховішча, дасюль — як і пагранзастава — надзеі на лепшае заўтра гміны.

Мацей Халадоўскі

Страйкаваць ці вырашаць?

Верасень гэтага года для Беларусі стаў характэрным адным з самых моцных пратэстных выступленняў прыватных прадпрымальнікаў. Будучы сведкам растучай актыўнасці гэтага, яшчэ 15 гадоў таму не існаваўшага слою грамадства, нельга не канстатаваць яго глыбокую раздробленасць.

Пачынаючы з 1 верасня лідэры прадпрымальніцкіх прафесійных аб'яднанняў заявілі аб правядзенні бестэрміновга страйку. Мэтай яго правядзення бачылася не толькі дасягненне паслаблення падатковага прэсу і адмены рашэння аб абавязковасці наяўнасці касавых апаратаў, але і правядзенне „круглага стала" з уладамі, каб растлумачыць апошнім усю цяжкасць гандлярскай долі.

Аналізуючы мінулыя падзеі, варта адзначыць, што збольшага было дасягнута толькі пасяджэнне разам з прадстаўнікамі выканаўчай улады. Але адразу пасля гэтак званага „круглага стала" прадпрымальнікі заявілі аб яго неэфектыўнасці. Што, дарэчы, лёгка зразумець, бо за гэты самы стол прыйшлі пасядзець не міністры ці віцэ-прэм'еры, ні, канешне ж, адмыслова запрошаны Аляксандр Лукашэнка, а чыноўнікі такога рангу, ад якіх залежыць хіба толькі нагляд за выкананнем даручэнняў сваіх босаў. Гэтыя самыя намеснікі міністраў, уважліва выслухаўшы ўсё, што казалі лідэры прадпрымальніцкага руху, шчыра заявілі, што яны не ў стане дабівацца пазітыўнага водгуку з боку вышэйшай улады на гандлярскія патрабаванні і, тым болей, паўплываць на змену ці адмену не надта лагодных да бізнесоўцаў прэзідэнцкіх указаў. Такім чынам прадстаўнікі прэзідэнцкай вертыкалі яшчэ раз падкрэслілі, што кіраванне ўнутранай палітыкай у Беларусі ідзе не праз раней зацверджаныя законы, а праз дэкрэты аднаго чалавека, улады ў якога як у былых расійскіх імператараў.

Здаецца, што пасля такога „круглага стала" дробным прадпрымальнікам варта было б зразумець, што яны не ёсць тым слоем сённяшняга беларускага грамадства, да якога, па меншай меры, з павагай ставіцца лукашэнкаўская адміністрацыя. Тым не менш страйк працягваўся каля 10-12 дзён (у розных рэгіёнах па-рознаму). Яго выдатным чыннікам магло б стаць перарастанне ў палітычны страйк, які спрабаваў наладзіць так званы Беларускі страйкавы камітэт прадпрымальнікаў 11 верасня. Але чаго не адбылося, таго не адбылося, бо гэты самы страйкам ёсць канкурэнтам у адстойванні інтарэсаў дробных гандляроў да іншай структуры — Аб'яднанай Радзе прадпрымальнікаў. Таму калі першыя не далучыліся да пачатага з 1 верасня страйку з эканамічнымі патрабаваннямі, то другія адмовіліся падтрымаць аднадзённы палітычны страйк, лічачы, што кіраўнікі канкурэнтнай арганізацыі спрабуюць „на іх карку" прыдбаць палітычныя дывідэнды. У выніку не атрымалася ні ў тых, ні ў другіх. Так званы бестэрміновы эканамічны страйк паціху згас, а іскры палітычнага ўспыхнулі толькі там-сям у некаторых буйных гарадах.

З 1 кастрычніка Аб'яднаная Рада прадпрымальнікаў зноў абвяшчае аб правядзенні яшчэ аднаго бестэрміновага страйку зноў з вышэй апісанымі эканамічнымі патрабаваннямі. Да страйку з таго ж дня напрыканцы жніўня заклікаў і Беларускі страйкам прадпрымальнікаў. Ці здолеюць яны насамрэч выступіць разам, пакуль сказаць цяжка. Але здаецца, што лідэрам дробных гандляроў варта пачаць усведамляць, што звычайны класічны страйк, калі прадпрымальнік не працуе, наносіць большую шкоду яму самому, бо да яго не вяртаюцца ўкладзеныя ў тавар грошы. Існуючая канкурэнцыя ў прадпрымальніцкім руху таксама наносіць велізарную шкоду і не дае магчымасці кансалідавацца, што на руку агульным для іх праціўнікам.

Таму, магчыма, „круглыя сталы" для выпрацоўкі агульных і кансалідаваных дзеянняў варта праводзіць сярод прадпрымальніцкіх актывістаў. Тады і ўзнікне рэальны шанц прымусіць прыслухацца да сваіх праблем тых, ад каго залежыць дабрабыт грамадства і хто існуе за кошт падаткаў, у тым ліку і з гандляроў.

Уладзімір Лапцэвіч

Веру ў беларускі голас

[1 ☞ працяг]

„Nie rozumiem zbyt wygórowanych żądań. W tym województwie mieszkają nie tylko Białorusini, ale też mamy Łomżę, Suwałki i inne miasta. Białorusini nie będą decydować i wskazywać kto, gdzie i kiedy".

— Якія практычныя меры прымае Беларускі выбарчы камітэт у Беластоку дзеля здзяйснення згаданых мэтаў?

— На выбары ў Гарадскую раду ў Беластоку выстаўляем спіскі нашых кандыдатаў у пяці акругах. Нашы спіскі такія, як і наша грамадства: на іх людзі розных прафесій і пакаленняў, асобы паважаныя ў сваім асяроддзі. Гэта абнадзейвае на выбарчы поспех.

Таксама нашы кандыдаты ў Ваяводскі сеймік уяўляюць наша бачанне ролі Падляшша і напрамкаў яго развіцця. Напрыклад, у горадзе Беластоку наш спісак у Падляшскі сеймік адкрываць будзе Сакрат Яновіч, у Бельска-Сямятыцкай акрузе — прафесар Ян Чыквін, а ў Гайнаўска-Сакольскай спісак даручана адкрываць мне.

Галоўнай нашай цяпер справай з'яўляецца распрацоўка нашай праграмы, у якой знойдуцца такія задачы самакіравання, якія кранаюць усіх людзей, бо, напрыклад, голад ці беспрацоўе не кіруюцца ні нацыянальнасцю, ні веравызнаннем.

Апрача агульных гаспадарчых спраў мы ўсё ж такі выразна ставім канкрэтныя справы беларускай праблематыкі. У Беластоку галоўнай справай лічым стварэнне Цэнтра беларускай культуры. Мы, як падаткаплацельшчыкі, адводзім грошы ў бюджэт, але на нашы культурныя патрэбы ў ваяводстве ці горадзе адводзяцца смешныя квоты. Усе гавораць пра прыцягненне ў наша ваяводства інвестараў — чаму ж тады закрываюцца камунікацыі ў рэгіёны, дзе пражываюць беларусы? Хто сюды прыедзе? Як маюць даехаць да лекараў ці чыноўнікаў звычайныя людзі? Як патэнцыяльны інвестар будзе ўкладваць у нас грошы, калі няма як давезці людзей на працу?

Памкненні некаторых людзей, каб стварыць з нас своеасаблівую рэзервацыю, я разумею, але... нат індзейцы ў ЗША могуць карыстацца дабром тае зямлі, дзе яны жывуць. У нас жа ўсе хочуць абадраць нашых людзей з усялякіх грошай.

Пасля 1989 года розныя сілы шмат абяцалі нашаму рэгіёну. Чаму тады ўсюды ўзнікалі спецыяльныя эканамічныя зоны, толькі не на Падляшшы? Пры Цімашэвічы таксама ўзнікалі такія зоны, толькі не ў нас. Усе гавораць пра гаспадарчую актывізацыю на ўсходнім напрамку, але нічога дзеля гэтага не паўстала ні ў Беластоку, ні ў Бельску, ні ў Гайнаўцы. Як могуць нас прадстаўляць гмінныя ці павятовыя чыноўнікі, якія лічаць сябе дзяржаўнымі чыноўнікамі, блытаючыя вызначаныя ім законам ролі, і якія не хочуць гаварыць на нашай мове? Як можна аж так саромецца і не любіць свайго народу, сваіх выбаршчыкаў, сваёй спадчыны?

Людзі, што былі раднымі, бурмістрамі, войтамі ад беларускіх выбарчых камітэтаў у сваіх мясцовасцях і гмінах на працягу апошніх дванаццаці гадоў самакіравання зрабілі ўсё для выраўноўвання цывілізацыйна-культурнай адсталасці між нашай бацькаўшчынай і іншымі рэгіёнамі Польшчы. Таму веру, што наш беларускі голас і гэтым разам выбярэ сярод нашай меншасці, з прадстаўнікоў беларускіх выбарчых камітэтаў такіх людзей, якія чатыры наступныя гады будуць умела гаспадарыць нашымі грашыма і развіваць беларускую культуру і асвету.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксандр Вярбіцкі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Будучыня прадпрыемства „Гамех" у прыватызацыі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Малады экіпаж еўробуса сустрэўся з самаўрадаўцамі

Увальненні ў „Гамеху"

Дырэкцыя Машыннага прадпрыемства „Гамех" у Гайнаўцы ўручыла ўвальненні трэцяй частцы працоўнага калектыву прадпрыемства, які ў канцы жніўня састаўлялі 202 асобы. Пасля кансультацый з прафсаюзамі ўправа рашылася паменшыць колькасць звольненых з 73 да 69.

„Гамех" задоўжаны ў банках, прадпрыемствах і публічных установах на 6 мільёнаў злотых. Доўг гэты састаўляе вартасць паўгадовай вытворчасці прадпрыемства. У чэрвені ў Гаспадарчым судзе ў Беластоку складзена было прашэнне аб адкрыцці судовага пагадняльнага працэсу з крэдыторамі прадпрыемства „Гамех". У ліпені судовы выканаўца Раённага суда ў Бельску-Падляшскім у час аўкцыёна прадаў 31 штуку сродкаў транспарту, пакідаючы толькі 9 неабходных для існавання прадпрыемства машын.

— Будучыня прадпрыемства будзе залежаць ад некалькіх спрыяючых акалічнасцей. Зараз мы размаўляем з банкамі ў справах сплаты крэдытаў і з адным банкам ужо ўступна дамовіліся ў гэтай справе. Памяншэнне публічнай запазычанасці залежаць будзе ад прымянення ў нашым прадпрыемстве плана Гжэгажа Калодкі. Нават з гэтым планам не ўвесь наш публічны доўг можна будзе ліквідаваць, некаторую задоўжанасць трэба будзе сплачваць самім, — заяўляе дырэктар прадпрыемства „Гамех" Бернард Жылік. — Ці хочам гэтага, ці не, патрэбная прыватызацыя прадпрыемства, для існавання якога неабходны датковы капітал. Калі б не было даўгоў, „Гамех" мог бы існаваць як дзяржаўнае прадпрыемства. У выпадку задоўжанасці я не думаю, што нашы крэдыторы захочуць доўга чакаць, пакуль мы самі будзем выплачваць даўгі. Калі будуць ахвотныя прымаць удзел у прыватызацыі прадпрыемства інвестары, будзе яна ажыццяўляцца.

Зараз працаўнікі атрымалі зарплаты за ліпень, частку грошай за жнівень. Выплачваецца ператорміная плата за сакавік. Падпісаны новыя дамоўленасці на продаж вытворчасці замежным (краіны былога Савецкага Саюза) і польскім прадпрыемствам. Асноўнымі вырабамі „Гамеху" будуць устаноўкі для спальвання драўляных адкідаў, розныя віды сушыльняў і запасныя часткі для іх. Дрэваапрацоўчыя станкі, якім цяжка знайсці збыт, будуць вырабляцца толькі на канкрэтныя заказы. На зломе 2002 і 2003 гадоў прадпрыемства плануе атрымаць невялікія даходы. Зараз падпісаны заказы на больш за трохмесячную прадукцыю, якая можа ажыццяўляцца дзякуючы сродкам з задаткаў, якія банкі дазволілі выкарыстаць на вытворчасць.

Дырэктар Бернард Жылік паведамляе, што папярэдняе кіраўніцтва прадпрыемства брала крэдыты на вытворчасць з 1998 года. Яны штогод аднаўляліся на зломе зімы і вясны, а фінансавыя цяжкасці паявіліся ў 2001 годзе. Іх прычынай была вытворчасць машын, на якія не было збыту.

Аляксей Мароз

Еўробус у Гайнаўцы

10 верасня ў Гайнаўку прыехаў еўробус. Яго экіпаж спачатку спаткаўся з вучнямі Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы, а пасля з жыхарамі Гайнаўшчыны. Маладыя энтузіясты далучэння Польшчы да Еўрасаюза расказалі пра еўрапейскія структуры і датацыі, якімі змогуць пакарыстацца самаўрады і прадпрымальнікі.

Белліцэісты і настаўнікі даведаліся пра некаторыя ўмовы ўступлення ў Еўрасаюз. Хаця апошнім часам модным стала выказвацца за далучэнне да Еўрасаюза, аднак не ўсе вучні і настаўнікі з'яўляюцца прыхільнікамі гэтай ідэі. Намеснік дырэктара белліцэя Аляксандр Лаўрыновіч мяркуе, што славяне павінны яднацца паміж сабою.

Сабраныя ў магістраце ставілі экіпажу еўробуса пытанні. Гайнавяне і жыхары навакольных вёсак цікавіліся магчымасцямі атрымання фінансавай дапамогі з Еўрасаюза. Абвінавачвалі яны донараў у празмернай бюракратыі. З імі часткова згадзілася каманда еўробуса, але яны тлумачылі, што дакументы неабходныя для праверкі верагоднасці прадпрымальнікаў выступаючых за дапамогай. Юныя еўраэнтузіясты інфармавалі пра фонд SAPARD, сродкамі якога могуць карыстацца сяляне і вясковыя самаўрады. Прысутныя наракалі, што вяскоўцам цяжка хадайнічаць аб фінансавай падтрымцы для інвестыцый, бо многім не пад сілу падрыхтаваць адпаведныя дакументы. Мусяць яны наймаць спецыялістаў для распрацавання бізнес-плана, хаця не ведаюць ці атрымаюць ад еўрапейскіх фондаў дапамогу. Беларусы, якія састаўлялі пераважную большасць сабраных, даведаліся, што ў аб'яднанай Еўропе цяжка будзе вырашаць пытанні нацыянальных меншасцей на ўзроўні дзяржавы, паколькі падтрымка іх дзейнасці будзе належаць кампетэнцыі няўрадавых арганізацый.

Малады экіпаж еўробуса сядзеў пад блакітнымі сімваламі Еўрасаюза. Адчувалася, што ён моцна перакананы ў мэтазгоднасці аб'яднання з Еўропай. А прысутныя на спатканнях з імі будуць яшчэ вырашаць ці падтрымаць уступленне ў Еўрасаюз.

Аляксей Мароз

Выбарчы спектакль

У пачатку верасня я паспрабаваў даведацца ў Гміннай управе аб кандыдатах на войта і радных. Кампетэнтная чыноўніца адказала: „Рана аб гэтым гаварыць. Як аформіцца дзейнасць гміннай выбарчай кампаніі, дык гэта афіцыйна пачне прымаць заявы ад выбарчых камітэтаў".

У Чаромсе і наваколлі цішыня дагэтуль царыла (25 верасня), быццам макам засеяў. Ніякіх афіцыйных прозвішчаў і ніякай праграмы ніхто не прад'яўляў. Кожны сабе паціхеньку збіраў адпаведную колькасць подпісаў (25 на раднага). Першым на кузаўскай сцэне паказаўся цяперашні радны. Бачыў я, як да суседа заходзіў. Мяне абмінуў. Значыцца, спярша „даверaныя" асобы наведаў. Аб другім кандыдаце ад прыяцеляаднавяскоўца даведаўся. Праз краму справа афармлялася. Хапіла сяброўскай размовы за піўцом і дваццаць тры подпісы занесены былі на спісак за няпоўныя суткі. Пасля загаварылі, неафіцыйна разумеецца, аб іншых кандыдатах. Налічыў пецярых. Ці будуць іншыя? Час пакажа. Адно стала мне вядомым, што кузаўскія кандыдаты, не прад'явілі канкрэтнай выбарчай праграмы, адно ахвоту здабыць мандат дэпутата і высокую дыету. У час нашай размовы з прыяцелем, гэты канстатаваў: „Пераможцам стане той, у каго больш сваякоў і пабрацімаў будзе". Пагаджаюся з ягонай думкай. Дванаццацігадовая дарога да дэмакратыі паказала, што ў незалежнай і свабоднай дзяржаве законы на ўсё дазваляюць, напрыклад, арганізаваць сямейныя суполкі і весці сямейны бізнес, бяскарна выкідаць на вуліцу добрага работніка, а на яго месца прымаць некампетэнтнага сваяка ці „добрага прыяцеля" і г.д. А ці ж гэтак быць павінна?

Сёлета ўпершыню выбіраць будзем у непасрэдных выбарах войтаў, бурмістраў і прэзідэнтаў гарадоў. Не дазваляйма загубіць гэты шанц. Пакуль паставім „крыжык" пры прозвішчы свайго кандыдата, дык разважна падумайма, ці гэтаму чалавеку можна даверыць? Ці стане ён на баку справядлівасці і будзе працаваць на карысць грамадскасці, ці стане звычайным прахадзімцам і ахутаецца сваякамі ды пабрацімамі і будзе служыць іхняй „палітыцы". З таго, што зараз прыкмячаю ў сваёй вёсцы, не лічу на хуткія перамены. Аднавяскоўцы трымаюцца стэрэатыпаў і не хочуць нічога мяняць. А што з кандыдатамі на войта? Вядомыя прозвішчы пецярых, якія прэтэндуюць на мяккае крэсла кіраўніка гміны. Аб іхніх праграмах нічога не чуваць. Няўжо паступаюць паводле прымаўкі „Маўчанне — золата"?

Уладзімір Сідарук

Самаўрады каштуюць!

У капіталізме кожны дзярэ як можа. Наша капіталістычная дэмакратыя дазваляе на гэта самаўрадам. Жнівеньскі нумар „Wieści Podlaskich" апублікаваў выдаткі некаторых гміннных самаўрадаў за 2001 год. Знаходзяцца тут даныя з Нарвы, Нараўкі, Боцек, Браньска, Дубіч-Царкоўных, Кляшчэляў і Шудзялава.

Паводле гэтых паказчыкаў найбольшую так званую „дыету" атрымлівалі радныя ў Нарве — 184 злотых за адно пасяджэнне! Самая скупая дыета аказался ў Дубічах — толькі 78 злотых. Зарплата старшыні рады даходзіла да 1 000 злотых у месяц, а ў Кляшчэлях і Нараўцы перавышала тысячу. Найменш зарабляў старшыня ў Дубічах — 603 злотых. Агулам за цэлы 2001 год самаўрад у Нараўцы каштаваў гміну 76 389 злотых. Тры разы менш каштаваў самаўрад у Дубічах, бо толькі 23 234 злотых. Іншыя гміны выдаткавалі на свае самаўрады тысяч пяцьдзесят.

Як відаць, самым рацыянальным аказаўся самаўрад у Дубічах-Царкоўных. На думку звычайных выбаршчыкаў, радныя некаторых гмін бяруць вялікія грошы, быццам яны на пасяджэннях перагружалі тоны цэменту.

У гмінных самаўрадах сядзяць пераважна адны і тыя ж людзі, якія штодзень працуюць у розных установах і прадпрыемствах. Гэта найчасцей настаўнікі, ляснічыя, прэзасы, дырэктары, часам пенсіянеры, адным словам — гмінная эліта.

Набліжаюцца самаўрадавыя выбары і варта выбаршчыкам задумацца, за каго прагаласаваць. А можа аддаць голас за кандыдатаў, якія яшчэ не зарабілі ў самаўрадах?

Мікалай Варанецкі

Вачыма паляка

Выбарчая вера ў амнезію

Не магу пазбыцца ўражання, што шмат апошніх фактаў, якія адбываюцца ў самаўрадах, хоць, несумненна, карысныя, служаць толькі перадвыбарчай „паказусе". Быццам хацелі паказацца прэзідэнты, бурмістры і войты, якіх магчымы паўторны выбар на тыя ж пасады не будзе залежаць ужо выключна ад партыйных калег, а непасрэдна ад волі люду.

Некаторыя з прэзідэнтаў гарадоў і бурмістраў інтэнсіфікуюць дзеянні гэтак званага шырокага грамадскага маштабу. Вось, возьмем, для прыкладу, Беласток і некаторыя навакольныя гміны. У апошні час знайшліся тут грошы на мамаграфічную праверку грудзей жанчын. Бесперапынна чую ў беластоцкім тэлебачанні аб чарговай серыі доследаў. У самой сталіцы ваяводства жанчыны на бясплатнае даследаванне грудзей могуць ісці тысячамі. Ну, дык вельмі добра. Толькі чаму якраз цяпер актывізаваліся беластоцкія гарадскія ўлады, і хочуць памагчы сотням, калі не тысячам беластачанак? Быццам лепш пазней, чым ніколі. Быццам лепш перад выбарамі, чым пасля выбараў. Тым каталіцка-нацыянальная ўлада Беластока хваліцца, але скрывае іншыя балючыя грамадскія пытанні, у якіх загразла. Вось адкрыты пару месяцаў таму элегантны госпіс па вуліцы Сабескага, аднолькава медыяльна агучаны, як і справа мамаграфіі, трапіў у даўгі. Як казалі мае сябры-лекары і спецыялісты, даўгі сталі расці ад самага пачатку існавання шпіталя для невылечна хворых. Улада з прэзідэнтам Рышардам Турам паказала: дбаем пра нямоглых, уміраючых. Адвярнулася спінай, калі пасля шумнага адкрыцця пачаліся праблемы. Хто будзе гасіць даўгі гэтаму асяродку? Ці, можа, хто будзе яго зачыняць?

Гэтаксама было з акцыяй, якая датычыла ўключэння святлафораў на адным з найбольш небяспечных скрыжаванняў вуліц: Нараўскай з Антанюкоўскай. За адабрэннем улады нічога не пайшло (перад усім — грошы). Не ведаю, можа, гэта вынік выбарчага суперніцтва паміж кандыдатам на прэзідэнта Чэславам Якубовічам, шэфам Управы дарог, а змагаючымся за рэелекцыю прэзідэнатм Турам, а і яшчэ ўключаючымся ў правіцовую барацьбу віцэ-прэзідэнтам Маркам Казлоўскім? А, можа, перадвыбарча выгадней было інвеставаць у мамаграфію, чым у сігналізацыю? Урэшце, удзячнасць электарата ў першым выпадку можа быць большая (патэнцыяльна меншая колькасць ахвяр). Так ці сяк, не паявіўся ніякі сігнал з магістрата, што святлафоры будуць, прынамсі ў найбліжэйшы час. Нічому больш чым прапагандзе, на маю думку, не служыла агучэнне (між іншым дзве гадзінныя справаздачы пра тое непасрэдна па трэцім канале тэлебачання) і пампезнае адкрыццё ў Варшаве Сякеркаўскага моста і незавершанага Сякеркаўскага шляху. Разумею: самы доўгі ў Польшчы мост, найдаражэйшая самаўрадавая інвестыцыя. Але, каб прэм'ер і прэзідэнт мелі яе адкрываць, гэта, здаецца, залішне. Да таго з блаславенствам прымаса Глемпа (*nota bene*: па мосце будуць праязджаць не толькі католікі). Канкрэтная мэта, схавана за тою пампезнасцю: аддайце свае галасы на СЛД, бо ж дзякуючы яму, нягледзячы на фінансавыя цяжкасці, адкрываюцца такія карысныя інвестыцыі (памятаеце: ПНР, якая была, такая была, але адкрылі тады Лазенкаўскі шлях, Цэнтральны вакзал і г.д., здаецца, такое чуем на фоне). Дарэчы, павеяла жахам, калі Лешак Мілер публічна зажартаваў з пастановы Галоўнага адміністрацыйнага суда, які ўсумніўся ў легальнасці пабудовы. Прэм'ер, быццам дасціпна, спасылаючыся на прысутнасць на ўрачыстасці прэзідэнта, разлічваў на памілаванне нядобранадзейных рашэнняў і адпучшэнне грахоў прымасам. Такія жарты, як вучыць вопыт, некаторыя дзяржаўныя чыноўнікі бяруць усур'ёз, а ў людзях застаецца такая думка пра ўладу: „Нічога не бойся, мы ўсё аформім". Дарэчы, пачакаем, пабачым. Ці хочаш таго, ці не, Сякеркаўскі мост стаў элементам пачатай тыдзень раней выбарчай кампаніі СЛД, змагання за ўладу ў Варшаве, але, пэўна, не толькі там. Пэўна, і далей, чым праз Сякеркаўскі мост — на ўсходзе Польшчы. Да таго вечарам прэм'ер выступіў у тэлебачані з заявай, што пасля прыняцця падрыхтаванага ўрадам бюджэту будзе ў наступным годзе яшчэ лепш. Вядома, так, як сцвердзіў на мосце — гарантам таго будзе супрацоўніцтва ўрада з самаўрадам (у здагадцы: тым, які будзе выводзіцца з СЛД).

Я разумею, што ўлада перад выбарамі мусіць паказвацца з як найлепшага боку, што верыць у бяспамяцтва грамадства на тэму яе былых дзеянняў або прыносіць абяцанні, якія з прычыны на тую быццам бы амнезію можна будзе размыць у гушчы бягучых праблем. Усё гэта — шыта грубай ніццю, а выбаршчык мае быццам бы дурня клеіць.

Мацей Халадоўскі

Суверэнная краіна Беларусь

Апошнім часам прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка вельмі часта падкрэслівае, што Беларусь гэта суверэнная краіна, а некалькі непрыхільных эпітэтаў у адрас расійскага калегі Уладзіміра Пуціна сведчыць пра спробу доказу тэзіса.

Вялікай палітычнай падзеяй у Беларусі была сустрэча Лукашэнкі 17 верасня з журналістамі ў прэзідэнцкай рэзідэнцыі. Хаця праходзіла яна ў прысутнасці вялікай колькасці падначаленых прэзідэнту работнікаў СМІ, аднак удзельнічалі ў ёй таксама журналісты, якіх цяжка было б назваць паклоннікамі прэзідэнта. Другой асаблівасцю сустрэчы была нагода ставіць пытанні, якіх гаспадар зусім не чакаў і праўдападобна не хацеў пачуць. Тэлебачанне вяло прамую трансляцыю з сустрэчы. Упершыню паказаны былі нецэнзураваныя нявыгадныя пытанні журналістаў.

Вядомы слухачам карэспандэнт Польскага радыё Уладзімір Пац пытаў пра перспектывы беларуска-польскіх адносін. Лукашэнка адказаў, што калі б Польшча была суверэннай краінай, яны напэўна былі б лепшыя. Аднак польскае праўленне мусіць з усяго апраўдвацца перад амерыканцамі. Калі толькі Польшча зробіць крок наперад у напрамку збліжэння з Беларуссю, Беларусь зробіць два крокі наперад.

Пераважная большасць пытанняў кранала справу інтэграцыі з Расіяй. Адказы даваліся ў адным тоне: „Беларусь мусіць быць суверэннай краінай. Не можа яна стаць губерняй Расійскай Федэрацыі. Нам патрэбны добрыя эканамічныя і палітычныя адносіны з Расіяй, але пра ўваход у Расію няма мовы" — дэкларавў прэзідэнт.

Сэнс новай рыторыкі стаў больш зразумелы, калі адзін з журналістаў спытаў пра палітычную будучыню Лукашэнкі, таму што ў адпаведнасці з канстытуцыяй у 2006 г. ён не можа больш кандыдаваць на пост прэзідэнта краіны. „У Беларусі, — адказаў прэзідэнт, — усё магчымае. Я законаў парушаць не буду, але калі народ захоча адмяніць закон, што можа зрабіць у выглядзе рэферэндуму, я яшчэ падумаю наконт наступных выбараў". Адказ сведчыў аб тым, што Лукашэнка ўжо думае пра чарговы тэрмін, а толькі незалежная краіна можа даць яму прэзідэнцкае крэсла. У Расіі ён мог бы, з крамлёўскага дазволу, быць, напрыклад, мінскім губернатарам, але і гэта няпэўнае.

На другі дзень каментатар першай праграмы расійскага тэлебачання Максім Сакалоў адкрытым тэкстам заявіў, што раўнапраўя паміж Расіяй і Беларусю няма і быць не можа. Беларусь адстае эканамічна і з'яўляецца палітычным аўтсайдэрам. Сакалоў даваў зразумець, што інтэлектуальны ўзровень беларускага кіраўніцтва не дае падстаў, каб успрымаць Беларусь як раўнапраўнага партнёра Расіі.

Адказваючы на пытанні журналістаў Лукашэнка прабаваў нават усміхацца, жартаваў, паводзіў сябе як прэзідэнт краіны. Зрабіў толькі адну памылку, прадоўжыў канферэнцыю і дазволіў задаваць пытанні журналістам, якіх вядучая сустрэчу не дапускала да мікрафона. Тады падняўся журналіст газеты „Народная воля" і спытаў пра велічыню прэзідэнцкага бюджэту і прыбытак ад гандлю зброяй. І гэты момант прэзідэнт псіхічна не стрымаў. „Я самый чистый человек в мире, я самый честный человек, хотя меня зовут православным атеистом, я от никого ничего не брал, а вы?" — паставіў пытанне Лукашэнка і зараз адказаў. „Вы грантабраннікі, за чужыя грошы, якіх напхалі поўныя кішэні, пішаце хлусню пра сваю краіну і прэзідэнта". Далей пачаў звычайна лаяць журналістаў „Народнай волі" і пагражаць закрыццём газеты. На шчасце вядучая аб'явіла канец прэс-канферэнцыі.

20 верасня Беларускае тэлебачанне паінфармавала пра прэм'еру спектакля „Князь Вітаўт" у Нацыянальным тэатры імя Янкі Купалы ў Мінску. Рэцэнзенты расхвальвалі тэатр і акцёраў, якіх раней не заўважалі доўгімі гадамі. Аднак зразумелай стала змена падыходу прапаганды да творчасці людзей гэтага беларускамоўнага тэатра, паколькі ў ліку гледачоў сядзеў сам Лукашэнка. Пасля спектакля прэзідэнт не шкадаваў цёплых слоў у адрас артыстаў, а на дадатак зрабіў кароткі даклад на тэму ролі інтэлігенцыі ў фарміраванні беларускага народа. Гаварыў пры тым на беларускай мове. „Бог даў нам такіх людзей", — і тут пасыпаліся прозвішчы стваральнікаў беларускай літаратуры, навукі, культуры. Без Пушкіна і Дастаеўскага.

Адна шчырая размова з Уладзімірам Пуціным так адмяніла Лукашэнку, што часам прэзентуецца ён як беларускі нацыяналіст. Мінскі люд нават адабрае тое, што ён гаворыць, інтэлігенцыя падкрэслівае, што гэта толькі часовыя змены выкліканыя эмоцыямі і неўзабаве ўсё вернецца да нормы. Тым часам прэзідэнт раскручвае прапаганду аб патрэбе захавання суверэнітэту краіны, у чым не сумняваецца ніводзін з суседзяў Беларусі.

Яўген Мірановіч

Узвядзенне языком

У нашых тутэйшых людзей пануе даволі справядлівае меркаванне, што мы тут з'яўляемся носьбітамі шэрагу станоўчых чалавечых якасцей. Мы талерантныя, гасцінныя, чыстасардэчныя, праўдалюбівыя. У адносінах да нашых „старэйшых братоў і сёстраў" мы ставімся зыходзячы з пэўнага геаграфічнага арыенціра. Заходнія люды бачацца намі агрэсіўнымі захопнікамі, служакамі „чужой веры", а ўсходнія — шчырымі таварышамі. Такі стан нашай свядомасці вынікае не з нейкага псіхічнага недахопу, але з даволі аднабаковага прапагандысцкага асвятлення нам акружаючага нас свету. Не маючы магчымасці навочна пабачыць сапраўдны вонкавы свет мы здадзены на распаўсюджваныя рознымі „дабрадзеямі" чуткі. І наш тутэйшы ранейшы космас наогул сфарміраваны „ведамі" з маскоўскай падачы, бо гэтак за час апошніх пакаленняў распарадзілася гісторыя. Сёння нам падаюць акуляры з другога боку планеты з іншым яе бачаннем. Гэта ў агульнасці.

Тое нашае пакаленне, якому жыццёвы пад'ём выпаў на семідзесятыя гады мінулага стагоддзя, сёння апынулася на этапе спуску. Гэты жыццёвы момант супаў з эканамічным заняпадам краіны і многія нашы людзі затужылі па бестурботнай эпосе таварыша Герка. Маўляў, „мы будавалі", а цяпер усё тое прапала. А дзеецца так, дзякуючы чарадзейскай сіле прапаганды. У палове згаданых сямідзесятых гадоў мне спатрэбілася купіць радыёпрыёмнік, і я стаў шукаць такі, у якім адсутнічаў бы прыём доўгіх хваляў — каб не слухаць, нават выпадкова, назойлівай і невыносна хлуслівай перадачы „Tu Jedynka". Мы тады „будавалі светлую будучыню" — „rozwinięte społeczeństwo socjalistyczne", „Другую Польшчу". Гэтак асвятлялася ў сродках масавай прапаганды, а ў сапраўднасці — пра што ўжо не згадвалася — Герэк тую „Другую Польшчу", той „развіты сацыялізм" пазычыў у... капіталістаў. А сёння настаў час расплачвацца... Наша грамадства сыграла ролю статыстаў у казцы пра залатую рыбку, думаючы, што было галоўным героем.

На днях на экране тэлевізара паказаўся прэм'ер-міністр Лешак Мілер, у „Jedynce". Пачуўшы з яго вуснаў, што маем аднапрацэнтны эканамічны пад'ём, я выключыў тэлевізар; наслухаўся я ўжо такіх казак. Мо я гэтым разам памыліўся гледзячы на тое, што дзеецца навокал нашага Беластока, мо падвяла мяне інтуіцыя, але ж здалося мне, што той пад'ём чыста перадвыбарчы, прапагандысцкі, што ён толькі на языку прамоўцы. І вельмі апасаюся, што наш радасны першы міністр, які распачаў як сапраўдны славянскі мужчына, закончыць па-французску. Ён жа таксама, як і агульна ўсе мы за новымі рупарамі, пераарыенціроўвае напрамак прыходу „светлай будучыні" — з захаду.

Аляксандр Вярбіцкі

Літаратурна-мастацкая старонка № 510

„Маладыя ваўкі” ў Беларускім ПЭН-цэнтры

Безальтэрнатыўнае абранне галоўнага рэдактара газеты „Наша ніва” Андрэя Дынько на пасаду першага віцэ-прэзідэнта Беларускага ПЭН-цэнтра выклікала гарачыя дыскусіі ў літаратурных колах Беларусі.

Рэч у тым, што папярэднік Андрэя Дынько прафесар Адам Мальдзіс яшчэ ўвесну гэтага года падаў у адстаўку, і Рада ПЭН-цэнтра не змагла знайсці яму сярод літаратараў сярэдняга і сталага веку дастойнае замены. Вырашылі спыніцца на маладой і даволі контраверсійнай кандыдатуры — Дынько. Доўга ўпрошвалі, пакуль рэдактар „Нашай нівы” ўрэшце згадзіўся. Ягоную кандыдатуру падтрымалі літаратурныя аўтарытэты: Васіль Быкаў, Святлана Алексіевіч, Карлас Шэрман. Дзеля гэтага і быў скліканы на пачатку верасня Агульны Сход ПЭН-цэнтра.

Спярша на сходзе вырашылі мерытарычныя пытанні: унеслі дробныя змены ў статут арганізацыі, заслухалі справаздачу прафесара Мальдзіса і старшыні рэвізійнай камісіі Валянціна Тараса. Аказалася, што Мальдзіс сышоў з пасады, бо займае яшчэ некалькі адказных пасадаў. У дадатку з-за адсутнасці грошай кіраўніцтва Беларускага ПЭН-цэнтра пазбылася двух аўтамабіляў, тэлецэнтра і мабільных тэлефонаў. Дзеля пакрыцця камунальных паслугаў офісу ў Мінску летась былі ўведзены сяброўскія складкі ў памеры 4 000 беларускіх рублёў (крыху больш за два долары) у месяц. Але і гэтую „дробязь” не ўсе здолелі заплаціць.

І вось нарэшце дайшлі да абмеркавання кандыдатуры Андрэя Дынько, які папярэдне выступіў з прамовай і выклаў сваё бачанне дзейнасці арганізацыі. Што тут пачалося! Супраць Дынько выступілі паэт Генадзь Бураўкін і празаік Юры Станкевіч, маўляў невядома хто стаіць за гэтымі маладзёнамі з „Нашай нівы”. Перакладчык Васіль Сёмуха ў сваім выступе выгукнуў: „Я баюся гэтых маладых ваўкоў!” Аднак Карлас Шэрман зазначыў, што Андрэй Дынько выдатны менеджэр, і, нягледзячы на тое, што закрываюць апазіцыйныя незалежныя газеты, трымае на плаву „Нашу ніву” і часопіс „Arche”. У дадатку яго кандыдатуру падтрымлівае сам Васіль Быкаў. На што Рыгор Барадулін, звярнуўшыся да мяне ціхенька (сядзелі побач), паіранізаваў: „Слухай, я ведаю Быкава не адзін дзесятак гадоў. Але якой халеры ўсе яны прыкрываюцца ягоным імем, нібы фігавым лістком? Вядома, кіраваць ПЭН-цэнтрам — гэта не смехуёчкамі ў «Нашай ніве» займацца”.

Кандыдатуру Андрэя Дынько падтрымалі ў сваіх прамовах паэты „новай генерацыі” Ігар Бабкоў і Алесь Аркуш. Сапраўды, калі няма больш годнага чалавека, а выбары безальтэрнатыўныя, дык чаму не даць шанцаў праявіць сябе гэтаму маладому і энергічнаму „менеджэру”? Тым больш, калі ПЭН-цэнтру апошнім часам так не стае свежай крыві і новых ідэяў. Урэшце, з 44 прысутных на сходзе сябраў 27 прагаласавала за Дынько, 3 — супраць, астатнія ўстрымаліся. Сход адзінагалосна прыняў у ганаровыя сябры ПЭН-цэнтра засуджанага журналіста газеты „Пагоня” Паўла Мажэйку, які зараз адбывае пакаранне — працуе на пілараме ў гарадку Жлобін Гомельскай вобласці.

Самым прыемным момантам сходу была прэзентацыя выдадзенай у выдавецтве „Каўчэг” кнігі Алеся Адамовіча „Vixi”. А прэмію Беларускага ПЭН-цэнтра імя Алеся Адамовіча сёлета атрымала журналістка Ганна Соўсь за цыкл рэпартажаў пра Курапаты для радыё „Свабода”.

Юры Гумянюк

Ганна на Янавым гасцінцы

Ганна Кандрацюк, ніўская журналістка, дзевяць гадоў хадзіла дарогамі Яна Тарасевіча, кампазітара з Беласточчыны, вядомага ў свой час і прадказваючага вялікую кар’еру, якога забіў час. Ды не да канца — дзякуючы, між іншым, нашай ніўскай каляжанцы і спрыянню ці не самога Неба, удалося вярнуць яго чалавечай памяці як чалавека, а плён яго працы не растраціць.

Тэксты, з матэрыялаў збіраных па зярнятку, з Ганніных вандровак, на працягу дзевяці гадоў друкаваліся ў „Ніве”, перадрукоўваліся ў беларускіх газетах і кнізе музыкі Віктара Скарабагатава. Героі кнігі *W stronę Tarasiewicza**, перакладзенай на польскую мову дзеля таго, каб шырэй прадставіць нашага земляка палякам не толькі на Беласточчыне, ягоныя вучні, сярод якіх самы славуты гэта кампазітар і дырыжор Ежы Максымюк, раскрываюць перад чытачом звычайную постаць гэтага незвычайнага чалавека. Пачынаючы ад Эдварда Шчасновіча, лістаношы, ніўскага карэспандэнта, які працаваў калісьці ў яго парабкам, канчаючы прафесаркай варшаўскай кансерваторыі і настаўніцай дзетак Тэрэзай Адамчык ды сумнымі ўспамінам пра ціхае пахаванне ў прысутнасці вучняў, якія ў самоце прасядзелі ноч у капліцы ў Саколцы ля пакойнага свайго настаўніка і прыяцеля. І хоць гэтым канчаецца гэтая кніга, але адчуваеш: не прапала праца гэтага чалавека, а яны, ягоныя вучні, маюць абавязак аддаць яму тое, што ўзялі. І вярнуць памяць.

Ці будзе так? Ежы Максымюк ахвяраваў яму сваю араторыю „Арбор”, значыць — „Дрэва”, якую мае прадставіць слухачам на 50-годдзе Польскага радыё ў Беластоку. Толькі раз (у „Выбарчай газеце”) было ўспомнена, каму ёй хоча аддзячыць гэтым творам і каго ўславіць. Пасля — ні слова, хоць амаль штодзень друкаваліся аб’явы. На сустрэчы ў Польскім радыё, калі, у прысутнасці Ганны Кандрацюк, бралі інтэрв’ю ў славутага музыкі, тады, калі ён загаварыў пра свайго маэстра і прыяцеля, рэдактар выключыў запіс. Без праблем успрымаецца празвішча Тарасевіча ў мызычных кругах у Варшаве. Тут — прабіваецца праз мур няведання і невуцтва. Гасцінец камяністы.

Зацікаўленне кампазітарам, а, мабыць, увогуле культурай, відавочнае было на прэс-канферэнцыі пра кнігу, арганізаванай „Нівай” як выдаўцом, у Цэнтры грамадзянскай адукацыі „Польшча-Беларусь”. З усіх газет прыслана была толькі журналістка з „Газеты выборчай” Моніка Жміеўская, якая, дарэчы, ужо пісала пра Тарасевіча і мастак Андрэй Валкавыцкі, родам з Белавежы, які таксама ўспомніў, што сам „ён наш”.

— Тэма, як аказалася, абрасла ўжо ў міфы і легенды, — піша ў заканчэнні кнігі Ганна Кандрацюк. — Я рашылася, аднак, на пераказ праз канкрэтную чалавечую прызму, выкарыстала таксама шматлікія дакументы, лісты і творы кампазітара. Публіцыстычны пераказ не заўсёды быў дастатковы, ён — пакуль толькі малы крок у бок музыкі Яна Тарасевіча.

Кнігу можна набыць у рэдакцыі „Нівы” і кнігарні „Акцэнт” па вул. Рынак Касцюшкі, 17.

Міра Лукша

* Hanna Kondratiuk, *W stronę Tarasiewicza*, Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok 2002, ss. 118.

Анна Каменска

Паэтыка

Ці хопіць дзеля таго быць пісьменнікам:

Што схоплена за дзікія крылы
гусь з тлустай шыяй,

Што ў павуцінні гарышча
блукаецца кошка патрацёўшая дзяцей,

Што здзіўляецца карова
мычаннем адлучанага дзіцяці.

Не трэба непакоіць друкарню дзеля таго:

Што ўгледзіш перапалох у вачах дзіцяці
уміраючага пасярод каталіцкіх пеянняў,

Што шмаргане цябе літасць над дзяўчынкай
прытуляючай ляльку да грудзей.

Што паспачуваеш гарбатай дзяўчыне
калі, закаханая, расчэсвае валасы,

Што ўбачыш адчайны плач расстання
патрасаючы плячыма мужчыны.

І ад бітай на вуліцы жанчыны
адвядзеш позірк.

Баюся, што ніводнае з гэтых пачуццяў
не завядзе да новай літаратуры.

Аднак:

Я з’яўляюся працавітай маці перапалохаў
— кажа Паэзія.

Пераклад Алены Анішэўскай

Шэсцьдзесят галасоў Прынёмання

Нядаўна ў Слонімскай узбуйненай друкарні выйшаў калектыўны зборнік літаратараў Гарадзеншчыны, што друкаваліся ў літстаронцы дзяржаўнай абласной газеты „Гродзенская праўда”, якая фактычна і прафінансавала выданне. Кніга называецца „Галасы”, і выдаўцы мяркуюць зрабіць яе штогоднікам.

Сярод 60 аўтараў сустракаюцца і такія даволі вядомыя ў літаратурных колах Беларусі імёны як літаратуразнавец Ігар Жук (Гродна), паэты Мар’ян Дукса (Смаргонь), Рычард Бялячыц (Шчучын), Уладзімір Васько (Ліда), Сяргей Чыгрын (Слонім)... Натуральна, што ў зборніку не знойдзеш „альтэрнатыўных галасоў” Гарадзеншчыны, скажам, Алеся Чобата, Юрыя Гумянюка ці Сяргея Астраўца. Па-першае, яны не друкуюцца ў літстаронцы дзяржаўнай „Гродзенскай праўды”, а па-другое, іх творы прагучалі б у „Галасах” моцным дысанансам.

Зрэшты, цешыць тое, што выхад новай кнігі падтрымалі дзяржструктуры і тое, што складаў і рэдагаваў яе такі таленавіты майстар слова як лаўрэат літаратурнай прэміі імя А. Куляшова паэт Юрка Голуб.

Л. С.

Юрый Баена

Верш

Гэты верш,
кірыліцай пісаны
чорным па белым,
цвёрды як камень.

Лёгкі і вольны
над нівамі ён,
як жаваранак звоніць.

Напрадвесні адродзіцца.
Над гарызонтам узнімецца птах —
Фенікс.

Зорка

старонка для дзяцей

У Орлі спявалі, гулялі, выступалі

21 верасня ў Орлі, на пляцы ля гістарычнай сінагогі, Гмінны асяродак культуры арганізаваў I Арлянскія сустрэчы з культурай і мастацтвам для дзяцей і моладзі.

Мерапрыемства прыцягнула многа публікі. Не разагнала яе і капрызнае сонечна-дажджлівае надвор'е. Найбольш, вядома, з'явілася бацькоў, сваякоў і настаўнікаў. Прыехалі запрошаныя госці. Не даехаў толькі адзін дзіцячы вакальны калектыў з Дубіч-Царкоўных.

Сустрэчу вяла дырэктар Арлянскага асяродка культуры Аліцыя Собунь. Гукаўзмацняльнікі і пачастунак гарачым гарохавым супам арганізавала школа.

Даволі абшырную праграму прадставілі дзеці з Орлі. Выступілі яны як вакальна-тэатральны калектыў „Дзеці пана Клекса", беларускі дзіцячы танцавальна-вакальны калектыў (дзейнічае пры ГОК) і школьны вакальны калектыў „1/3". Багатую танцавальную і спявачую праграму прывезлі з сабой госці. Сярод іх два калектывы з Гайнаўскага дома культуры і тэатр „Нарваль" з Беластока. Апошнюю частку свята запоўніў канцэрт арлянскага маладзёжнага рок-гурту „Co jest grane". Пасля было вогнішча падрыхтаванае пажарнікамі і дыскатэка для дарослых.

Наймалодшыя выканаўцы з Орлі выступілі бадзёра і адважна, а публіка не шкадавала воплескаў. Пецярых выканаўцаў атрымалі падарункі ў выглядзе гадзіннікаў (купілі іх за чэрвеньскую грашовую ўзнагароду ад Кураторыі за ўдзел у Ваяводскім аглядзе дзіцячай песні „Музыка і танец"). Самыя бурныя бравы атрымаў адважны дэкламатар Адась Адзіевіч. Адась мае славу выдатнага конкурсніка. У красавіку мінулага года на Агульнапольскім гарцэрскім паэтычным конкурсе ў Лодзі атрымаў вылучэнне за маналог „Дзённік вучня", ён таксама лаўрэат беларускага конкурсу „Роднае слова". Зараз разам з танцавальна-вакальным калектывам праспяваў беларускія песні. Сярод вакалістаў гурту трэба адзначыць і Наталлю Міранчук.

Выступае Адась Адзіевіч

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Зоркай Сустрэч быў Гайнаўскі калектыў народнага танца і песні. Ён найперш паказаў польскія танцы, а пасля — беларускія. Вельмі каларытна паказаўся і другі калектыў ГДК — „Ілюзія". Прэзентавалі яны сучасны танец і вылучаліся дынамікай выканання і тэатралізацыяй. Варта адзначыць, што большасць гайнаўскіх выканаўцаў гэта гімназісты, якія вывучаюць беларускую мову.

Беластоцкі тэатр у сваю чаргу прадставіў 80-хвілінны спектакль „Чалавек-цень". Распавядаў ён пра шкодны уплыў наркотыкаў. Праграма, хаця дыдактычная і павучальная, вельмі падабалася гледачам. Калі пайшоў дождж, публіка перанеслася ў пажарнае дэпо.

Пра I Арлянскія сустрэчы з культурай і мастацтвам для дзяцей і моладзі арганізатарка Аліцыя Собунь сказала:

— У Орлі многа дзіцячых мерапрыемстваў, аднак большасць з іх адбываецца ў школе і яны маюць закрыты характар. Мы падумалі, каб выйсці да шырэйшай публікі, каб дзяцей пабачылі бацькі, бабулі і дзядулі, сваякі, каб усе весела і карысна правялі час. Не лічу сябе адзінай арганізаткай, дапамагалі мне людзі з нашай гміны. Свята мы арганізавалі дзякуючы г.зв. коркаваму фонду (сродкам прыдбаным камісіяй па праблемах алкагалізму). Дзеці вельмі ахвотна прыходзяць на заняткі ў Дом культуры. Папраўдзе, я найлепш адчуваю сябе ў ролі інструктара. Люблю працаваць з дзяцьмі. На жаль, не заўсёды ёсць дзеля гэтага час.

Міхал Мінцэвіч

Польска-беларуская крыжаванка № 40

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) дашліце на працягу трох тыдняў у „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 36: Веласіпед, чарада, рапуха, раса, арс. Вечар, лапа, парус, саха, гід, пава, адрас.



Узнагароды, **запісныя кніжкі**, выйгралі: **Віялета Лемеш** і **Наталля Сахарчук** з Беластока. Віншуем!

Разам цешымся поспехамі

Міхал Мінцэвіч гутарыць з Ірэнай Адзіевіч, сакратаром гміны Орля, у прыватнасці — мамай Адася Адзіевіча.

— Як ваш Адась рыхтуецца да конкурсаў? Ці перажывае свае выступленні? Адкуль у яго такая цікавасць і здольнасці да беларускіх песень і вершаў?

— На рэпетыцыі ходзіць у ГОК, аднак сольныя выступленні рыхтуе ў хаце. Вельмі хвалюецца і баіцца, што можа забыцца сваю партыю тэксту і тады з-за яго калектыў праваліцца на сцэне. Сваіх выступленняў не ўспрымае як гульню, ён амбітны хлопчык.

Вядома, да беларускай мовы я яго крыху намаўляла, бо ў хаце не зусім размаўляем па-беларуску. На беларускую мову ходзіць з першага класа. Ужо два разы выступіў у дэкламатарскім конкурсе „Роднае слова" і ён лаўрэат I месца ў сваёй узроставай катэгорыі. Разам цешымся яго поспехамі. Здольнасці, мабыць, па дзеду Яраславу, які быў інструктарам і членам калектыву „Арляне".

А можа вырасце з гэтых захапленняў — пабачым! Ён пакуль у трэцім класе.

Расчараванне

Убачыў раптам унук Юлік —
Косы абрэзала бабуля.
— Скажу табе я, дарагая,
Жанчына ты ўжо не старая.

Усцешана бабуля ходзіць,
Юлік бабулю амалодзіў.
Унук азваўся за хвіліну:
— Цяпер ты як стары мужчына.

Віктар Швед

Памёр Артур Вольскі

5 верасня 2002 года, на 78 годзе жыцця, пасля доўгай хваробы памёр Артур Вольскі.

Артур Вольскі запісаў цудоўную карціну беларускай дзіцячай літаратуры. Ён вядомы таксама як пісьменнік і празаік для дарослых чытачоў і як грамадскі дзеяч.

Нарадзіўся 23 верасня 1924 года ў Койданаве на Міншчыне, у сям'і пісьменніка Віталя Вольскага-Зэйдэля. Вучыўся ў Віцебскім мастацкім вучылішчы, закончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Нейкі час працаваў рэдактарам газет „Вясёлка", „Бярозка", „Чырвоная змена". Яго сын Лявон Вольскі — вядомы як лідэр рок-гурту „Н.Р.М.".

Паслухайце як бліскуча і як добра гучаць загалоўкі дзіцячых зборнікаў:

— „Ад А да Я — прафесія мая", „Маленькім сябрам", „Чарнічка", „Што такое мікра тое", „Дзедаў госць", „А куды падаўся дождж", „Карусель",„Ізумрудавы горад, ты?", „Рагатка", „Лясныя мастакі", „Жывыя літары", „Еду ў госці да слана", „Сонца блізка ўжо зусім",„Дабярусь да нябёс", і г.д.

Вершы Артура Вольскага часта друкаваліся на старонках „Зоркі". Ён — любімы аўтар удзельнікаў конкурсу „Роднае слова". Бывалі гады, калі чвэрць усяго рэпертуару складалі менавіта вершы гэтага паэта. Вершы Артура Вольскага вельмі складныя, іх рытм падказвае тэатралізаваць выступленне.

На развітанне прыгадаем верш паэта. Думаецца, што калі аўтар „дабярэцца да нябёс" — там таксама стане весялей! Бо пад „стрэшкамі", дзе вершы Артура Вольскага, сумата будзе вечна ісці з дымам.

Вяселікі

Бегалі вяселікі
сцежкамі
ды ўзмежкамі,
сыпалі, як сеялі,
смешкамі, пацешкамі.

Смешкамі,
пацешкамі
сыпалі як сеялі,
жартамі ды ўсмешкамі
сумату развеялі.

Ой, смешкі-пацешкі,
ідзіце пад стрэшкі,
з намі сядайце,
сумаваць не давайце!

Сам Артур Вольскі хацеў каб яго вершы дапамагалі знайсці адказы хаця б на некаторыя з тых загадак, што падносіць нам, дзецям і моладзі, жыццё.

— А калі яны яшчэ і пазабаўляюць чытача трошкі — казаў аўтар — я палічу гэта за шчасце.

Зорка

Артур Вольскі

Няма прыгажэй

Высозныя сосны
адвечнага бору —
пад самае сонца,
пад самыя зоры.
Зубры ў гушчары
пратапталі сцяжыны
туды дзе ніводнай
няма каляіны.
Маліны даспелыя
просяцца ў жмені,
грыбы ў кашы,
бы ў загоне алені.
Вітаюць нас
птушкі і дрэвы гасцінна...
Ну дзе яшчэ знойдзеш
такія мясціны?
Усім на зямлі
я давесці бяруся
няма прыгажэй
ад маёй Беларусі!

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Дзяўчынкі з Убеля (Міншчына) — мясцовасці, дзе жыў Станіслаў Манюшка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Сябры з Беластока

Дзённік Міколы

Чорны кот

Аднак Чорны кот уцёк, а можа лепш сказаць — прапаў без следу. Тамаш і Яраслаў, быццам нічога не здарылася, пачалі гаварыць пра футбол.

— Вы што? — крыкнула на іх Аня, — звар'яцелі ці як! Нам як найхутчэй трэба знайсці мастака.

— Так-так, — я адкрыў дзверы і першы кінуўся ў бок кватэры жывапісца. Мы гналіся па драўляных усходах на сам ніз. І калі ўжо апынуліся ля дзвярэй мастака, я націснуў на званок. Нор Узі прывітаў нас здзіўленай усмешкай.

— Здароў, дзеці, здарылася нешта?

— Так! — сказалі мы гуртам і мастак запрасіў нас у свой дом. Мы пераступілі парог і зразу апынуліся ў вялікім круглым пакоі-кватэры. На сценах віселі сотні карцін. Мы селі ў велізарныя фатэлі, прыаздобленыя таемнымі, экзатычнымі знакамі.

— Вы адзін у змозе нам дапамагчы, — пачала Аня.

— Гаварыце, у чым справа? — адказаў Нор Узі.

— Скажыце, што сталася з вашым Чорным катом?

— Ну так, — уздыхнуў Нор Узі. — У пэўны момант мой кот прапаў, як у ваду кануў. Я ўжо думаў, што нехта яго ўкраў або забіў. Але пасля двух тыдняў мой калега знайшоў яго над берагам мора і прывёз мне яго назад дахаты. Так... толькі на другі дзень мой кот папаў пад машыну і загінуў. Я не хаваў яго ў зямлі, толькі палажыў у шуфляду і цяпер кожны дзень размаўляем.

— Як гэта так? — здзівіўся я, — звяроў не хаваем у шуфляду, яны ж будуць смярдзець.

— Даражэнькі хлопча! — мастак паляпаў мяне па плячах, — калісьці ўсё зразумееш...

— А чаму мы нядаўна бачылі вашага ката на гарышчы? — усклікнула Аня.

— Не, дзеці, гэта не мой кот, — сказаў мастак упэўнена. Мой ляжыць мёртвы ў шуфлядзе шафы.

— Мы не малыя, каб верыць у казкі, — адазваўся Тамаш.

— Тады паглядзіце самі.

Мастак адсунуў шуфляду і там мы пабачылі мёртвага ката Нора Узі. Папраўдзе ён выглядаў як жывы і здавалася, што толькі прыкідваўся перад намі. Яго поўсць мела бліскучы здаровы выгляд і здавалася, што кот толькі што заснуў.

Мы разгубіліся і ўжо хацелі ісці.

— Хвілінку! — Нор Узі пераступіў нам дарогу. — Скажыце, як выглядаў той кот?

— Цалкам чорны, — сказала Аня, — толькі хвост у яго быў чамусьці белы.

— Пачакайце.

Мастак зноў загарадзіў нам дарогу.

— Вам нельга адсюль выйсці! — вярнуў нас і зноў пасадзіў у вялікія фатэлі. Я адчуў на спіне халодныя дрыжыкі...

(працяг будзе)

(нак-с)

Дагаварыліся

У аўтобусе гарадскім
Ехаў летняй парою Якаў,
А на прывязі разам з ім
Неадлучны яго сабака.

— За сабаку ты заплаціў? —
Запытаў кантралёр білетаў.
— Я сабакі свайго не купіў,
У падарку дастаў псіну гэту.

Віктар Швед

Уладзімір Арлоў, Адкуль наш род

Захоп Беларусі Расіяй

Падзелы Рэчы Паспалітай

Ужо з часоў Пятра I расійскія войскі вельмі часта без усялякага дазволу ўрываліся на беларускія землі. З дапамогаю сваіх салдатаў цары садзілі на трон нашай дзяржавы патрэбных ім людзей і рыхтаваліся да захопу Беларусі.

У 1772 годзе тры краіны — Расія, Аўстрыя і Прусія — дамовіліся паміж сабой падзяліць Рэч Паспалітую.

Кожная з гэтых дзяржаваў адарвала сабе частку чужой зямлі. Расія захапіла ўсходнюю Беларусь з гарадамі Віцебскам, Магілевам, Воршай, Мсціславам, Гомелем...

Новая мяжа, якая праходзіла па Дзвіне, разрэзала на дзве часткі Полацк. Сафійскі сабор апынуўся ў Расійскай імперыі, а старажытны Бельчыцкі манастыр, дзе некалі жылі полацкія князі, застаўся ў Рэчы Паспалітай.

Лепшыя людзі Вялікага княства Літоўскага і Польшчы спрабавалі выратаваць сваю дзяржаву ад пагібелі. Тут было створана першае ў свеце міністэрства народнай асветы — Адукацыйная камісія, што адчыняла школы і навучальні.

Сойм зацвердзіў першую ў Еўропе канстытуцыю — асноўны закон краіны. Канстытуцыя забараняла магнацкія ўсобіцы і ўмацоўвала ў краіне парадак.

Але час быў страчаны.

На абшары Рэчы Паспалітай зноў уварваліся расійскія войскі. У 1793 годзе Расія захапіла цэнтральную Беларусь разам з Мінскам, а яшчэ праз два гады — астатнія землі былога Вялікага княства Літоўскага.

Так здзейснілася даўняя мара маскоўскіх уладароў. Наша Бацькаўшчына страціла сваю самастойнасць і надоўга трапіла ў расійскую няволю.

(працяг будзе)

Фатаграфуе прыроду

У Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы знаходзіцца выстаўка фатаграфій Малгажаты Карпюк. Можна ўбачыць на ёй фрагменты дрэў, кветкі і лясныя дэталі, якія былі сфатаграфаваны каля Бярнацкага Мосту і Белавежы. Здымкі аўтарка робіць ад 1999 года і дабівалася ўжо поспехаў у школьных конкурсах. Заняла другое месца ў Агульнапольскім конкурсе „Драўляная архітэктура рэгіёна Белавежскай пушчы", яе фатаграфіі былі ўключаны ў выстаўку „Нацыянальныя паркі", якая паказвалася ў розных гарадах Польшчы.

Малгажата Карпюк

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

— Хачу, каб захавалася тое, што фатаграфую, бо людзі паміраюць і гінуць дрэвы. Мая мара — увекавечваць маю Малую айчыну — Бярначчыну. Спачатку доўга шукаю месцы да фатаграфавання, а пасля раблю здымкі. У фатаграфаванні не найважнейшая якасць фотаапарата, але веды і вопыт, — заяўляе Малгажата Карпюк.

Выконвае яна таксама партрэты, найчасцей сваіх сяброўак, знаёмых і старэнькіх бабуль. Карыстаецца фотаапаратам „Зеніт 122" і робіць здымкі ў натуральным асвятленні. Хоча купіць сабе новы фотаапарат і рабіць фотарэпартажы. Малгажата — сяброўка Клуба беларускіх спраў, які працуе ў белліцэі, іграе ў школьным баскетбольным клубе ды любіць таксама пагуляць у валейбол.

Аляксей Мароз

Фільмавы вечар

Восень з халоднымі, але прыгожымі вечарамі для большасці з нас абазначае час сямейных спатканняў. Гэтыя супольныя вечары можна таксама цікава правесці ў кінатэатры. На гэты тыдзень прапаную два фільмы.

„Містэр Бонс" Гары Голфмаера зацікавіць усіх кінаманаў. У афрыканскіх джунглі разбіваецца самалёт, гінуць усе пасажыры, ратуецца толькі малое дзіця, якім заапекаваліся жыхары аднаго з дзікіх плямён.

Хлопчык расце і з часам аказваецца, што патрапіць адчытваць будучыню з касцей. Такія здольнасці выкарыстоўвае кароль племені Тсонг, які марыць аб тым, каб адна з яго новых жонак нарадзіла яму сына. Да гэтай пары нараджаліся ў яго толькі дочкі. Аднойчы Бонс адчытвае з касцей, што кароль будзе мець „сына з сонца". Тсонг прыпамінае сабе свой раман у сонечным горадзе Сан-Сіці і пасылае Бонса, каб адшукаў ягонага сына. Аказваецца, аднак, што малады мужчына нават не думае аб гэтым, каб пазнаць свайго бацьку. Не спакушае яго нават каралеўская карона.

Ці містэр Бонс пераканае маладога каралевіча вярнуцца ў сваё дзікае каралеўства? Варта даведацца! На экране пабачым Лона Шустэра, Дэйвіда Рамзея, Фейзан Лоў.

„Афёра з караламі" ў рэжысуры Чарлза Шэера спадабаецца аматарам гісторый тыпу „плашча і шпагі". Дзея адбываецца ў 1785 годзе, калі французская каралева Марыя Антаніна была абвінавачана ў любоўных зносінах з кардыналам Луі дэ Роан. Ініцыятарам гэтай інтрыгі была Жан дэла Мат, якая пераканала кардынала ў тым, што каралева сапраўды кахае яго. Каб усё выглядала натуральна, падказала купіць яму каралы вартыя паўтара мільёна ліўраў. Дайшло нават да таемнага спаткання кардынала з каралевай, якую, як пазней аказалася, заступіла падобная на яе куртызанка. Каралы трапілі ў рукі Жан, але ненадоўга, бо інтрыга была выкрыта. Дзяўчына і кардынал апынуліся перад судом, а як закончылася іх справа даведаецеся ў кінатэатры.

На экране пабачыце Гілары Суонк, Джанатана Прайса, Саймана Бэйкера і Адрыен Броўдзі.

Паўліна Шафран

„Цаглінкі" сталі лаўрэатам

У верасні ў Быдгашчы адбыўся X Агульнапольскі агляд мастацкага руху сеніёраў. Удзельнічалі ў ім 54 песенныя калектывы і адзінаццаць салістаў з усяе краіны, у тым ліку салісты і тры гурты з Падляшскага ваяводства. Усе яны раней былі лаўрэатамі акруговых элімінацый Агульнапольскага конкурсу мастацкай самадзейнасці сеніёраў.

Вялікага поспеху дабіліся падляшскія калектывы. Гран-пры заваявалі „Верасы" з Саколкі. Другое месца заняў беларускі фальклорны калектыў „Цаглінкі" са Старога Ляўкова (Нараўчанская гміна), які вядзе інструктар Мікалай Мяжэнны з Гродна. Спевакі выступілі ў беларускіх народных касцюмах. На

Фота з АРХІВА

аглядзе „Цаглінкі" праспявалі тры беларускія песні: „Ажаніўся стары дзед", „Ой, пад мостам" і „Гэй мой конік вараны" ды тры польскія „Czemu kalino w dole stoisz", „Kiedy skończyłam szesnaście lat" і „Czerwona kalina jagody rodziła". Вельмі спадабаліся яны тамашняй публіцы. Ляўкоўскіх спевакоў-сеніёраў папрасілі выступіць яшчэ на другі дзень на гала-канцэрце. Праспявалі яны толькі тры беларускія песні пад бурныя апладысменты гледачоў.

Варта адзначыць, што падчас агляду толькі „Цаглінкі" як адзіныя спявалі пабеларуску. Сардэчна віншуем лаўрэата. Жадаем яму далейшых поспехаў.

(яц)

Юбілейны кангрэс

У „Доме дружбы" ў Варшаве, па вул. Маршалкоўскай 115, 19 верасня г.г. адбыўся III Кангрэс Аб'яднання Польшча-Беларусь у дзесятую гадавіну яго дзейнасці.

Кангрэс адкрыў старшыня Аб'яднання д-р Баляслаў Хмялінскі, які прывітаў сардэчна ўсіх прысутных, у тым ліку гасцей Кангрэса — пасла Рэспублікі Беларусь у Варшаве Мікалая Крэчку, Генеральнага консула Рэспублікі Беларусь у Гданьску Міхала Аляксейчыка і старшыню Аб'яднання супрацоўніцтва Польшча-Усход Стэфана Наўрата.

У сувязі з заканчэннем дыпламатычнай місіі ў Польшчы Мікалая Крэчкі С. Наўрат і Б. Хмялінскі ад імя сваіх Аб'яднанняў уручылі паслу лісты-падзякі за плённае супрацоўніцтва. Пасол М. Крэчка зачытаў віншавальны ліст Аб'яднанню Польшча-Беларусь ад міністра замежных спраў Беларусі Міхаіла Хвастова і ўручыў Б. Хмялінскаму карціну з выявай Чырвонага касцёла ў Мінску. Б. Хмялінскі запрапанаваў прысутным мінутай цішыні ўшанаваць памяць памерлага Арсенія Ваніцкага, старшыні Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Кангрэса Зыгмунт Стабэрскі зачытаў віншавальныя лісты з Мінска ад БелТКСа, ад Таварыства Беларусь-Польшча і ад Беларускага дзяржаўнага універсітэта — Факультэта міжнародных адносін.

Старшыня Аб'яднання Б. Хмялінскі выступіў з дакладам аб дасягненнях арганізацыі на працягу пяці мінулых гадоў. Арганізацыя налічвае 1 500 членаў, згуртаваных у шасці ваяводскіх аддзелах: Люблінскім, Любушскім, Лодзінскім, Мазавецкім, Падляшскім і Паморскім.

У галіне навукі Аб'яднанне арганізуе і ўдзельнічае ў канферэнцыях, сесіях, навуковых семінарах з удзелам навуковых супрацоўнікаў з Польшчы і Беларусі. Варта прыгадаць навуковую сесію на тэму „Усходняя і Заходняя Беларусь у міжваенным перыядзе" (1997 г.), семінар у Варшаве на тэму „Выбраныя праблемы грамадскай палітыкі Беларусі" (1997 г.), польска-беларускую канферэнцыю „Міжнародныя юрыдычныя аспекты правоў дзіцяці" (Гродна, 1997 г.). Аб'яднанне садзейнічае наладжванню супрацоўніцтва паміж польскімі і беларускімі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі.

У сакавіку 2002 года з выпадку дзесяцігоддзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Польшчай і Беларуссю ў Варшаве адбылася канферэнцыя на тэму „Польска-беларускія адносіны. Сучаснае становішча і перспектывы развіцця", арганізаваная Аб'яднаннямі Польшча-Беларусь, Польшча-Усход і Пасольствам Рэспублікі Беларусь.

У галіне культуры Аб'яднанне праводзіць канферэнцыі, выстаўкі, канцэрты, фестывалі. Аб'яднанне ўдзельнічала ў польска-беларускай канферэнцыі „Шлях да ўзаемнасці" (Белавежа, 1997), у канферэнцыі польскіх і беларускіх пісьменнікаў „Новая экуменія ў культуры" (1998), у міжнароднай канферэнцыі „Адам Міцкевіч і народная культура" (1998). У двухсотую гадавіну з дня нараджэння А. Міцкевіча адбылася канферэнцыя „Збліжэнні польскага і беларускага народаў" (Белавежа, 1998 г.).

Праца з моладдзю гэта адна з найважнейшых задач Аб'яднання. Пачэснае месца займае тут Алімпіяда беларускай мовы. Адбываецца яна ўжо восем гадоў. Узрастае колькасць фіналістаў атрымоўваючых права ўступу без экзаменаў у многія навучальныя ўстановы ў Польшчы. Ранг гэтага мерапрыемства павышае ўрачыстае падсумаванне вынікаў Алімпіяды ў Беларусі з удзелам прадстаўнікоў культуры, асветы і медыяў. Старшынёй камітэта Алімпіяды з'яўляецца праф. А. Баршчэўскі, кіраўнік Кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта, намеснік старшыні Аб'яднання Польшча-Беларусь.

Другой важнай формай працы Аб'яднання ў асяроддзі моладзі з'яўляецца арганізацыя адпачынку дзяцей і моладзі з Беларусі ў Польшчы. Польская моладзь выязджае ў Беларусь у групах арганізаваных Турыстычным бюро „Калінка" ў Варшаве, дырэктарам якога з'яўляецца намеснік старшыні Аб'яднання Польшча-Беларусь Юзаф Брыль.

Аб'яднанне з'яўляецца таксама ініцыятарам гаспадарчага супрацоўніцтва паміж Польшчай і Беларуссю. Спрыяюць гэтаму супрацоўніцтву польска-беларускія сустрэчы, семінары, напрыклад, семінар „Добрасуседства" (Брэст, 2000 г.). Вельмі важным мерапрыемствам Аб'яднання быў I З'езд гарадоў-супрацоўнікаў Польшчы і Беларусі, які адбыўся ў сакавіку г.г. у Брэсце. Прыняла ў ім удзел 100-асабовая дэлегацыя прадстаўнікоў ваяводстваў, паветаў і гмін Польшчы. З боку Беларусі па-за прадстаўнікамі партнёрскіх гарадоў удзельнічалі прадстаўнікі дзяржаўных улад і гаспадарчых суб'ектаў, зацікаўленых супрацоўніцтвам з Польшчай.

Аб'яднанне супрацоўнічае з многімі арганізацыямі і ўстановамі. На Кангрэсе старшыня Падляшскага аддзела Аб'яднання Юзаф Макавецкі, які ўвайшоў у нававыбранае Галоўнае праўленне, запрапанаваў ладзіць супрацоўніцтва з беларускімі арганізацыямі ў Беластоку.

Дэлегаты выбралі Галоўнае праўленне, старшынёю якога з'яўляецца Баляслаў Хмялінскі. Прэзідыум складаюць: Аляксандр Баршчэўскі, Юзаф Брыль і Марэк Заракоўскі — намеснікі старшыні, а таксама Зыгмунт Стабэрскі — член Прэзідыума. У Галоўную рэвізійную камісію ўвайшлі: Кшыштаф Звалінскі — старшыня, Тадэвуш Карпікевіч і Віктар Швед — члены камісіі.

Віктар Швед, намеснік старшыні Падляшскага аддзела Аб'яднання Польшча-Беларусь

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Прывітанне Бельскага епіскапа Грыгорыя

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Манашкі прапануюць культавую літаратуру

На Галавасека ў Шчытах

11 верасня Праваслаўная царква ўшаноўвае дзень пакутніцкай смерці Іаана Хрысціцеля. Гэтае свята, якое ў народзе называюць Галавасекам, асабліва ўрачыста адзначаецца ў Шчытах-Дзенцялове. У тамашняй царкве Усячэння галавы св. Іаана Хрысціцеля штогод збіраюцца сотні вернікаў з мясцовага і суседніх прыходаў. Сёлета гэты дзень адзначаўся ў Шчытах асабліва ўрачыста — прыход наведаў Бельскі епіскап Грыгорый. Цёплае надвор'е, нягледзячы на моцныя парывы ветру, прыцягнула многіх цукерачнікаў, якія сёлета — упершыню — расставілі свае ларкі не ўздоўж шашы, але на прасторным пляцы побач царквы.

Каля дзесятай гадзіны раздаліся званы і хрэсны ход з удзелам святароў з суседніх прыходаў выйшаў сустрэць уладыку. Немалая шчытоўская царква не памесціла ўсіх вернікаў і шмат іх запоўніла пляц вакол храма, а некаторыя — гэта характэрна для Шчытоў — падаліся на мяжуючыя з храмам могілкі, дзе некалькіх святароў асвячалі магілы.

Ад года айцец мітрат Міхал Лукашук ужо на заслужанай пенсіі, і абавязкі шчытоўскага настаяцеля выконвае яго зяць а. Ян Сцепанюк. Бацюшка Лукашук вельмі шанаваны ў сваім прыходзе з-за ягонай сціпласці. Ён не цураўся ніякай працы ў карысць прыхода, напрыклад, асабіста прыбіраў могілкі ці будаваў плябанію.

— Стары бацюшка даўжэй гаварыў пропаведзь і больш зразумела, — сказала мне адна пажылая прыхаджанка з Крывой. — Ён пабудаваў драўляную плябанію, у якую ўвайшоў новы настаяцель. Калі зрэзвалі старыя хвоі на акраіне могілак, то бацюшка сам закінуў вяроўку і першы ўвайшоў на хвою. Маладыя баяліся, а ён палез; тады набралі смеласці і маладыя. Каторая хвоя гадзілася для пабудовы, а каторую прадавалі і куплялі драўніну. Найперш паставілі гаспадарчы будынак, дзе складвалі матэрыял на плябанію; пасля паставілі плябанію. І гэты малады таксама парадак трымае, у царкве парадак і чысціня, кветкі стаяць. Гміна навезла крыху зямлі, выраўняць пляц каля плябаніі.

Хто звоніць? У нас ёсць такія дзеці, што ўжо звоняць на службу; звоніць таксама стараста з Галадоў, — тлумачыць жанчына.

Каля брамы ў храм і на прыцаркоўным пляцы многа духоўных і свецкіх асоб са скарбонкамі, якія збіралі грошы на царкоўныя пабудовы. Пад цвінтарным мурам маладая цыганка (мне сказала, што яна з Малдовы) на каленях, з тэкстам на картачцы; людзі на яе быццам не звярталі ўвагу.

Каля званіцы некалькі сталоў з багатай культавай прапановай: іконкамі, крыжыкамі, кніжкамі, якія прадаюць манашкі з Беларусі і Украіны.

— Мы з манастыра каля Роўнага, — сказала мне адна з іх. — Наш манастыр існуе ад дзевяці гадоў; там мы молімся. Вядзем вялікі агарод, самастойна вырабляем усе будаўнічыя і іншыя працы, шыем, спяваем. Час ад часу прыязджаем сюды, бо тут многа знаёмых, якія бывалі ў нашым манастыры. Летам працуем тут у людзей пры збіранні трускалак. Працуем, каб крыху адбудаваць наш манастыр, які дзевяць гадоў таму быў вернуты нам у жахлівым стане. Перад намі многа працы, але не трацім надзеі. Дзякуем мітрапаліту Саву, епіскапам Грыгорыю і Іакаву ды ўсім бацюшкам, якія час ад часу дапамагаюць нам.

Маладая манашка паспяшала ў царкву, бо матушка прасіла, каб яна сваім спевам дапамагла царкоўнаму хору.

Свята, пасля святой літургіі, закончыў таксама ўрачысты хрэсны ход вакол храма.

Міхал Мінцэвіч

Дом з відам у неба

На аўтобусным вакзале ў Бельску вісяць паведамленні, што з 1 верасня тамашні пэкаэс скасаваў каля дваццаці курсаў у навакольныя вёскі. Я направіўся ў Кожына і мой аўтобус яшчэ паедзе. На вакзале забірае ён аднаго толькі пасажыра — мяне. У цэнтры горада дасядаюць яшчэ тры жанчыны. І гэта ўсё — саракамесны аўтобус набраў чацвёра пасажыраў — роўна 10%! Зараз за Бельскам, у Белай, дзве пасажыркі сыходзяць. Захацелі злезці на павароце і шафёр пакорліва там спыняецца — уразрэз з правіламі дарожнага руху, ствараючы немалую небяспеку іншым ездакам. Калісь шафёры пэкаэсаўскіх аўтобусаў паводзілі сябе панамі, а сёння ім, як у вядомай мюзіклавай песеньцы, *los przyszedł zły*. Бо ж за скарачэннем курсаў трэба чакаць і скарачэння шафёрскіх штатаў... А не дагодзіш пасажыру, той можа паскардзіцца і бывай праца. З Белай у Кожына едзе двое пасажыраў — 5%.

За Бельскам шмат зямлі ляжыць аблагом. На адным з такіх аблагоў закладзены новыя могілкі... Дзе-нідзе на палетках людзі збіраюць бульбу.

У Кожыне на маё месца сядае трое пасажыраў. У вёсцы пуставата, людзі падаліся ў поле. У краме адзін толькі прадавец, чакае пакупнікоў. Даведваюся, што ў будынку былой школы, які праз нейкі час засялялі турэмшчыкі, завяршаецца аддзелка прытулку для састарэлых...

Яшчэ седзячы ў аўтобусе я пачаў непакоіцца за лёс старых людзей, пакінутых на вёсках. Калі ж пакасуюць ім зусім тыя аўтобусныя лініі, дык як яны, калі занямогуць, будуць дабірацца да лекара ці хаця б у аптэку. І вось перада мною прадстала развязка гэтай праблемы...

Адпіхаю вароты падпертыя каменем. Усярэдзіне будынка працуе чатырох рабочых. Інфармуюць мяне, што ў мінулым годзе зрабілі туалеты (першы паверх дабудавалі раней), а ў гэтым годзе абтынкавалі сцены, паклалі пліткі, уставілі туалетнае аснашчэнне. Асталося толькі памаляваць сцены, уставіць электраразеткі, радыятары, прыбраць. Некаторыя працы выконваюць фірмы ці спецыялісты, іншыя — грамадскім чынам. Аб'ект мелі здаць у карыстанне 1 верасня, але аддзелка зацягнулася і здачу трэба крыху адтэрмінаваць. Наверсе мае быць 12 пакойчыкаў, а ўнізе лекарскі кабінет, морг і мо з 6 пакояў, дакладнага ліку работнікі не ведаюць і за гэтай інфармацыяй адсылаюць мяне да настаяцеля Кленіцкага прыхода, бо гэта ён усё задумаў і арганізуе. Пытаю, ці будуць поручні на лесвіцы і даведваюся, што хіба будуць.

Настаяцель а. Аляксандр Высоцкі інфармуе мяне, што прадбачвае засяленне прытулку сарака асобамі, калі іх будзе па адной-дзве ў пакойчыку, а калі больш, то змесціцца і 50. Ужо ёсць 15 кандыдатаў з Кленіцкага прыхода і 10 са Станіславова каля Новага-Двара-Мазавецкага; ёсць таксама ахвотныя з Сакоў, Рыбалаў, Войшкаў. У доме будзе лекар на штаце і па адной медсястры на кожную змену. Будзе прафесійны кухар і дзве памочніцы. Таксама прадбачаны пральня і прасавальня ды святліца. У наступным годзе будуць пастаўлены лавачкі на панадворку. Да дома дабудавана часоўня, у якой штодзённа будзе адпраўляцца богаслужэнне.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Дом для састарэлых у Кожыне

Жыхары нашых вёсак у росквіце сваіх сіл усе тыя сілы ўкладвалі ў тое, каб спярша сваіх дзяцей вывучыць, а пасля ўладкаваць іх недзе ў горад. І на перагружаных аўтобусах валачылі ім рознае вясковае дабро. Цяпер, пастарэўшы, асталіся яны і без сіл, і без сем'яў, асталіся выглядаць смерці. У Кожыне, за шчыльным мурам вышынёю ў тры з паловай метра, не аглянуцца ўжо на гэты свет, на якім скараталі сваё працавітае жыццё. Там будуць ужо глядзець адно ў неба. А святар, быццам адвакат перад Страшным судом, будзе штодзённа прасіць ім нябеснай ласкі за іх вясковыя грахі, вольныя і нявольныя...

Аляксандр Вярбіцкі

Папраўка

У артыкуле Міхася Хмялеўскага „50-годдзе царквы ў Востраве", які быў надрукаваны ў 39 н-ры „Нівы" ад 29.09.2002 г., дапушчана памылка ў прозвішчы. Цяперашнім старастам царквы ў Востраве, які быў узнагароджаны Ганаровай граматай, з'яўляецца **Аляксандр Грыц**. За памылку старасту, аўтара і чытачоў перапрашаем.

Рэдакцыя

Да 110-годдзя беларускай пісьменніцы Зоські Верас

Сяброўства пачалося ў лясной хатцы

Здаецца, было ўсё, як учора, а ўжо прайшло пятнаццаць гадоў з той першай незабыўнай сустрэчы з выдатнай беларускай паэткай, грамадскай дзяячкай, выдаўцом і проста шчырым чалавекам Зоськай Верас (Людвікай Антонаўнай Войцік) і не менш вядомым і знакамітым Лявонам Луцкевічам.

24 верасня 1987 года група слонімскіх настаўнікаў вырашыла наведаць старажытную беларускую Вільню. Разам з настаўнікамі ўдалося паехаць і мне. Калі мы прыехалі ў Вільню, то на плошчы Гедыміна нас чакаў ужо Лявон Луцкевіч. Пасля была цікавая экскурсія па нашай старажытнай сталіцы. Лявон Антонавіч яе добра ведаў і ўмеў вельмі цікава распавядаць пра яе завулкі і вуліцы, пра тых беларусаў, якія тут жылі, вучыліся, выдавалі кнігі і часопісы, трымалі друкарні і музеі. У мяне быў фотаапарат і я стараўся сфатаграфаваць Лявона Антонавіча з настаўнікамі. Праўда, ён казаў: „Сяргей, ты мяне так шмат не шчоўкай, больш фатаграфуй настаўнікаў, бо з-за мяне табе ў Беларусі можа быць непрыемнасць". Калі я вяртаўся дамоў, усё думаў, якая мне з-за гэтага сціплага і цікавага чалавека можа быць непрыемнасць? Пасля, калі я прачытаў у „Политическом собеседнике" артыкул Бумажковай, я ўспомніў словы Лявона Антонавіча. Але і тады, і цяпер мне няма каго баяцца, я жыву на зямлі сваіх дзядоў і прапрадзедаў, якія тут нарадзіліся, жылі і працавалі, і якія ганарыліся роднаю Вільняй і неаднаразова там бывалі. І любіць сваю Бацькаўшчыну ніхто і ніколі мне не забароніць, так, як і сустракацца з сябрамі там, дзе я хачу і калі хачу.

А ў той дзень мы фатаграфаваліся і з Лявонам Луцкевічам, і з Зоськаю Верас, але ўжо ў яе лясной хатцы за Вільняй. Туды мы паехалі пасля Віленскіх экскурсій, каб адведаць Людвіку Антонаўну. Адчыніўшы дзверы, мы быццам трапілі ў беларускі музей культуры і літаратуры. Карціны славутых мастакоў, фотаздымкі, кнігі, старая мэбля — усё тут, здавалася, дыхала нашым родным, беларускім. У адным з пакойчыкаў хаткі нас сустракала Зоська Верас, якой тады было ўжо 95 гадоў. Пасля пачалася размова. Нас цікавіла ўсё, бо мы ведалі, што Людвіка Антонаўна шчыра сябравала з многімі беларускімі дзеячамі, а таксама са слонімскім паэтам Гальяшом Леўчыкам. Дарэчы, у той дзень Зоська Верас падаравала літаратурнаму музею Сярэдняй школы № 7 горада Слоніма партрэт Гальяша Леўчыка, намаляваны беларускім мастаком з Вільні Алегам Аблажэем. Даўно ўжо няма гэтага музея і невядома куды трапіў добры партрэт Леўчыка. Вельмі шкада, што часам каштоўныя музейныя экспанаты трапляюць у ненадзейныя рукі кіраўнікоў школьных музеяў, якім быў, напрыклад, у Слоніме пенсіянер Мікалай Сідаровіч.

У час гэтай сустрэчы мы шмат новага даведаліся ад Зоські Верас пра Гальяша Леўчыка, яна паказвала нам яго пісьмы і паштоўкі, а таксама шмат расказвала і пра Максіма Багдановіча. У час успамінаў пісьменніца нават праслязілася. А пасля Людвіка Антонаўна раздавала аўтографы. Праўда, кніжак яе ў настаўнікаў не было, таму аўтографы яна ставіла ў сшыткі і блакноцікі. А калі я назваў сваё прозвішча, ад чаго мне было прыемна і здзівіла ўсіх прысутных, яна сказала: „А-а-а, Сяргейка, а я заочна ведаю цябе, шмат чытала тваіх твораў у прэсе...". Яна адчыніла шуфлядку, дастала адтуль сваю кніжачку „Каласкі" і падпісала: „Паважанаму Сяргею Чыгрыну на памятку сустрэчы. Вільня, 24.09.1987 г. Зоська Верас".

Пакуль настаўнікі размаўлялі з Людвікай Антонаўнай і разглядалі яе хатку-музей, мы з Лявонам Антонавічам абмяняліся адрасамі, пагутарылі пра жыццё ў Беларусі, пра навінкі беларускай кнігарні.

Вяртаючыся ў Слонім, было вырашана праз пэўны час зноў завітаць да Зоські Верас. Але такой мажлівасці ўжо не атрымалася: у 1990 годзе (ці не знарок?) нехта спаліў лясную хатку, а праз год не стала і яе гаспадыні.

Віленскія сустрэчы з Лявонам Луцкевічам і Зоськай Верас яшчэ больш натхнілі мяне на пошукі звестак пра забытых гісторыяй беларусаў. У канцы 80-х — пачатку 90-х гадоў я пачаў адшукваць па драбніцы звесткі пра Міхася Забэйду-Суміцкага, Наталлю Арсеневу, Хведара Ілляшэвіча, Гальяша Леўчыка, Сяргея Хмару, Францішка Аляхновіча і іншых прадстаўнікоў творчай беларускай інтэлігенцыі. Шукаў сляды Франука Грышкевіча, Уладыслава Казлоўшчыка і Станіслава Грынкевіча для будучай кнігі „Вяртанне да сваіх". Пра ўсіх іх я пытаўся ў Лявона Луцкевіча, ён дапамагаў мне, раіў да каго звярнуцца, дзе можна прачытаць пра забытых беларусаў і г.д. Я яму ў Вільню прысылаў беларускія кніжкі, а ён мне — віленскія выданні. Але, як мы ведаем, час не стаіць на месцы. І вельмі часта гэты час адлічвае сумныя хвіліны: у 1997 годзе не стала і Лявона Луцкевіча. Успамінам пра яго засталіся ў маёй хатняй кватэры кнігі ім дасланыя, пісьмы, паштоўкі і тая сустрэча 15-гадовай даўнасці.

Сяргей Чыгрын

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Там у вайну хавалі жаўнераў

Кожны прыдарожны крыж, гэта доказ людскога лёсу, знак смутку і адначасна надзеі, напамін нашчадкам.

У Крывятычах, Арлянскай гміны, пры канцы вёскі з боку Орлі, на скрыжаванні дарог, стаяць два крыжы. Адзін з іх з каменя, з пачатку XX стагоддзя, другі — з ластрыка з канца XX ст.; яны заўсёды ўпрыгожаны стужкамі і штучнымі кветкамі. У гэтым месцы бацюшка асвячае пасху, у гэтым месцы развітваюць памерлых у іх апошняй дарозе на арлянскія могілкі.

Побач крыжоў растуць старыя дрэвы. На адным з іх, што паміж крыжамі, нехта калісь замацаваў прыгожа выкаваны жалезны крыжык з маладзіком; сёння гэты крыж пачаў урастаць у дрэва. Даўней на тым месцы мабыць стаяў высокі сасновы крыж. Да абведзеных высокай сталёвай агароджай крыжоў прыстае абгароджаны нізкім драўляным плотам вялікаваты трохвугольны пляц, які ў час апошняй вайны выконваў ролю палявых могілак для савецкіх салдат.

Ішоў фронт, савецкія войскі выганялі немцаў з Орлі, наступаючы з боку Крывятыч. Згаданае месца, — як пару гадоў таму расказалі мне відавочнікі ваенных падзей, — упадабала сабе на выпадак гібелі савецкая шафёрка Соня. Неўзабаве яна была ранена на дарозе перад Орляй. Яе прывезлі ў Крывятычы, на суседскі з крыжамі панадворак Івана Дружбы, і там яна памерла. Пахавалі яе ў тым месцы, якое яна сабе наканавала — побач крыжа з 1913 года. Зараз пасля вайны астанкі салдат пахаваных там і ў іншых месцах былі эксгумаваны і пахаваны ў брацкай магіле праўдападобна на арлянскіх могілках.

Таму і на маё пытанне, чаму крыжы ў Крывятычах абведзены такой высокай агароджай, мне адказалі:

— Бо там у вайну хавалі салдатаў.

Міхал Мінцэвіч

Аляксандр

Аляксандр нарадзіўся ў 1919 годзе, калі ягоныя бацькі вярнуліся з бежанства. У роднай вёсцы Т. усё было спалена ды зарослае бур'яном. Ягоны бацька быў здольным, працавітым гаспадаром і хутка пабудаваў хату ды гаспадарчыя будынкі.

Рос і вучыўся Саша пры бацьках, а потым пайшоў вучыцца шаўцоўству і быў добрым шаўцом на ўсю ваколіцу. Ажаніўся ён у 1938 годзе. Узяў жонку з суседняй вёскі Б., з беднай сялянскай сям'і.

Усё змянілася, калі выбухнула II сусветная вайна і на Беласточчыну прыйшла Савецкая Армія. Вясною 1941 года прызвалі Сашу ў салдаты ў г.зв. рабочы батальён. Разам з іншымі пайшоў ён будаваць крэпасць у Асаўцы. Калі немцы напалі на Савецкі Саюз і разбілі Асавецкую крэпасць, Саша прабіраўся дамоў, але не ўдалося яму дайсці да роднай хаты. Перахапілі яго немцы каля Жэдні, адкуль дахаты было толькі 17 кіламетраў. Забралі яго як ваеннапалоннага і пасадзілі ў лагер. Было цяжка, кармілі бручкай ды чорнай кавай. Калі Саша сказаў, што ён шавец, тады яго прызначылі рамантаваць абутак нямецкім салдатам. Тады стала крышку лягчэй жыць, бо ўжо даставаў 300 грамаў хлеба ў суткі. У час пабыўкі ў нямецкім палоне можна было выслаць дамоў толькі адно пісьмо ў месяц. Так радня перапісвалася з Сашам і ведала што чуваць.

Калі амерыканцы пачалі перапісваць усіх палонных, Саша падаўся беларусам і сказаў, што хоча вярнуцца на родную Беласточчыну. Такіх як ён было многа і амерыканцы перадалі іх байцам Чырвонай Арміі. І зноў пачаўся тэрор. Байцы сталі іх дзяліць — палякаў налева, беларусаў направа. Палякаў адпусцілі дамоў, а беларусаў і васточнікаў пад канвоем, быццам здраднікаў айчыны, павезлі ў Савецкі Саюз. І так Саша трапіў у Данбас, у шахты. Зноў галодны ды халодны вымушаны быў выпрабляць наложаны план выработкаў.

Вярнуўся ў родную вёску летам 1946 года. Пачалося сямейнае жыццё. У 1948 годзе нарадзіўся яму сын. Заўсёды гаварыў, успамінаючы пабыўку ў Данбасе, каб хаця наесціся яму ўдоваль бульбы з лупінай, такі быў ён галодны ў шахтах. Саша надалей працаваў шаўцом і акуратна даглядаў гаспадарку. Гадаваў кароў ды свіней. Купіў быў у Беластоку пляц і пабудаваў прыгожую, аднапавярховую вілу. Потым перадаў зямлю дзяржаве, прадаў усе вясковыя будынкі і з жонкаю перасяліліся ў горад. Працаваў качагарам на розных дзяржаўных прадпрыемствах, а жонка прыбіральшчыцай у бальніцы. Час ішоў. Сын ажаніўся і стаў жыць на першым паверсе, а Саша з жонкаю ўнізе, бо ім, старэйшым, цяжка было хадзіць па сходках. Пайшоў Саша з жонкаю на пенсію. Нядрэнна ім жылося, ён падзарабляў шаўцоўствам, не курыў, не піў гарэлкі, а за ашчаднасці купляў залатыя пярсцёнкі, кольцы, завушніцы, гадзіннікі і хаваў ўсё гэта ў таемныя месцы. Свайму швагру загадаў, каб той пасля іх смерці перадаў сямейны скарб унучкам і ўнуку.

Некалькі гадоў таму памёр Саша. Пахавалі яго на гарадскіх могілках. Ягоная жонка два гады таму моцна пацярпела ад дарожнай аварыі. Праляжала яна тры тыдні ў бальніцы беспрытомная ды памерла. Швагер стрымаў слова, адкрыў іхнія тайныя сховішчы і перадаў усё багацце Сашавым унукам.

Мікалай Лук'янюк

Наша слова ў пагрозе

Адгалоскі

Нельга прамаўчаць цікавы артыкул Зосі Лемеш п.з. „Нашае? Роднае?" ў 36 н-ры „Нівы". Два пытальныя знакі падказваюць прызадумацца: як мы жывем, як шануем сваю мову, культуру, абычаі, гісторыю, фальклор... А ведаем, што калі няма культуры, тады чалавек паўдзікі і не шануе таго, што навокал яго і такога лёгка асіміляваць і перавесці на чужы капыл. Праўда, у маіх родных Дубічах-Царкоўных і навакольных вёсках дамінуе родная беларуская мова і мы ўсе гутарым па-свойму, аднак многія маладыя бацькі сваіх дзяцей ад калыскі вучаць па-польску і такія дзеці, калі вырастуць, не скажуць ні слова па-нашаму. Яны ўжо ганьбуюць нашай „трасянкай" і навечна парываюць з роднымі каранямі. Такі чалавек не беларус і не паляк, а ў ягоным сэрцы засталося пустое месца.

Я, як пісьманосец, штодзённа сустракаюся з людзьмі і бачу ды чую іхнія размовы, паводзіны і любоў да бліжняга. У нашай краме працуюць дзве прадаўшчыцы і яны, як і ўсе тутэйшыя, гутараць па-свойму. І смешна становіцца, калі нехта з нашай вёскі цокае да іх папольску, і яны, надзіва, адказваюць папольску таксама.

У нашай школе залатыя настаўнікі і з бацькамі сваіх вучняў усе гутараць пабеларуску і таму людзі іх паважаюць. Я неаднойчы чуў: гэта сапраўды вучоныя людзі, калі не саромеюцца роднай мовы. І гэта праўда: вучоны чалавек ніколі не адарвецца ад родных каранёў. Таксама ў нашай гміне ўсе працаўнікі гутараць па-свойму і наш войт Анатоль Паўлоўскі заўсёды са мною гутарыць на роднай мове. І на такога чалавека варта аддаць свой голас у час выбараў.

На жаль, калі бываю ў школе, дык сярод вучняў на перапынках дамінуе польская мова, але гэта не віна настаўнікаў, але бацькоў-дзівакоў. Бо толькі дзівак і пусты духова чалавек патрапіць падрываць свае карані.

Калісьці на маёй пошце адзін новапрыбылы начальнік хацеў мяне і другога лістаношу парабіць палякамі, але нічога з гэтага не атрымалася і ён сам пачаў гутарыць па-свойму. І цяпер, калі я яго часам сустракаю ў Гайнаўцы, дык ён з месца рубае па-свойму. З гэтага вынікае, што не трэба баяцца сваёй роднай мовы і свайго паходжання.

У Орлі ўсе жыхары, начальнікі і працаўнікі ўсіх устаноў цвёрда трымаюцца сваёй мовы. А ўжо ў Кляшчэлях справа адваротная, бо там амаль усе жыхары гавораць па-польску.

Мікалай Панфілюк

Захапленне ўсходам

У Бялках пад канец жніўня, адвячоркам, ля жанчын, што сядзелі на лавачцы, спынілася двое веласіпедыстаў. Аказалася, што гэта сужонства з Кракава, якое ўжо сем гадоў прыязджае адпачываць у вёску Трасцянку Нарваўскай гміны. Жывуць яны тады ў пустуючай хаце Анастасіі і Мікалая Паўлючукоў, якая стаіць пры дарозе ў Пухлы. У размове кракавяне расхвалілі наша чыстае паветра і ветлівасць мясцовых людзей. Папрасілі яны мяне і жанчын размаўляць па-беларуску, а самі заявілі, што яны ўжо па-беларуску чытаюць, але гаварыць ім яшчэ цяжка. А чытаць іх навучыла на кніжыцы „Бежанства 1915" настаўніца Галена Тапалянская, якая жыве насупраць арандаванай кракаўскімі летнікамі хаты.

Фота ЭВЫ БАРОВЕЦ

Схадзіў я дадому і прынёс зборнік „Словы ў лабірынтах", у якім змешчаны і мае вершы, ды папрасіў прачытаць іх. Калі мужчына чытаў, жанчына зрабіла нам здымак. Праз пару дзён атрымаў я здымак з надпісам на адваротным баку: „Aktor Teatru Starego Kazimierz Borowiec czyta po białorusku wiersze Mikołaja Łukianiuka. Białki, sierpień 2002 r."

Аказалася, што мы гутарылі з кракаўскім акцёрам Казімежам Бароўцам і яго жонкай Эвай. Развітваючыся з намі, госці абяцалі прыехаць да нас на адпачынак на другі год.

Захапленне Казімежа Бароўца ўсходам паклала свой адбітак на яго артыстычную дзейнасць. У 1997 г. зайграў ён у фільме „Historia o proroku Eliaszu z Wierszalina", а ў 2000 г. падрыхтаваў спектакль „Tysiąc kilometrów od świata", для якога адаптаваў апавяданні Эдварда Рэдлінскага „Listy z Rabarbaru". Спекталь гэты шмат разоў заваёўваў узнагароды на фестывалях аднаго акцёра.

Мікалай Лук'янюк

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Зіновій Галёнка і яго страусы: Лявон і Лявоніха

З патрэбы сэрца

Мяркуецца, што ў Польшчы існуе каля ста страусавых ферм. Нядаўна пара афрыканскіх страусаў паявілася ў Арэшкаве каля Гайнаўкі.

Агратурыстычная гаспадарка „Купала" паўстала з патрэбы сэрца, бо люблю прыроду, — кажа яе ўласнік Зіновій Галёнка. — Сабралі мы сюды з жонкай усіх гадавальніцкіх жывёл і птушак Падляшша, але для шчасця быццам не хапала нам экзатычных страусаў, якія, нягледзячы на ўсё, з'яўляюцца свайго роду магнітам, які прыцягвае турыстаў. Страус — гэта цяпер вельмі модная птушка.

Нашы страусы, якіх мы назвалі Лявонам і Лявоніхай, паўгадовыя і прывезлі мы іх з-пад Беластока. На прыём страусаў рыхтаваліся мы два гады. Хатка ім, крытая саломай, каштавала больш за саміх страусаў. Яшчэ ў ёй не жывуць, бо няма холаду. Маюць вялікую загараду, многа свабоды, маюць дзе купацца, адчуваюць сябе добра. Зараз за іх агароджай пасецца гоначны конік, з другога боку бегаюць сабакі і нічога дрэннага не дзеецца, хаця нас асцерагалі.

Ці двое страусаў гэта дастатковая колькасць? Не, гэта толькі пачатак гадоўлі. Магчыма, што які сусед нешта здасць нам у арэнду, тады гадоўлю пашырым. Таксама гоначны конь мае быць завязкай гадоўлі. Ну, вядома, калі жонцы не надакучаць мае агратурыстычныя фінціклюшкі звязаныя з прыродай, і не загадае вярнуцца ў сталіцу і займацца там сваёй фірмай. Пакуль усё складваецца добра і спадзяюся, што нічога не зменіцца.

Калега, у якога мы купілі страусаў, знаходзіцца ў падобных да маіх абставінах, г.зн. нехта вядзе ягоную фірму ў Беластоку, а ён даход з яе выдае на гадоўлю страусаў. На жаль, так сёння выглядае агратурыстычны бізнес — гэта вельмі дарагое хобі.

* * *

Страус, найбольшая афрыканская птушка, дасягае 2,5 метра росту і 130 кілаграмаў вагі. Ён можа набіраць да 70 км/гадз. хуткасці, вытрымоўвае тэмпературу ад -40°C да +50°C і дажывае 40-50 гадоў. У суткі з'ядае каля 2 кілаграмаў раслінага корму, напр. капусту, моркву, травяністую сечку, ячмень, авёс або спецыяльны гранулат з 8 вітамінамі. Для правільнага страваварэння патрэбны яму яшчэ жвір.

Гадоўля не патрабуе вялікага ўкладу працы, а страусава мяса мае вялікі шанс канкурыраваць з ялавічынай, бо худое і няма ў ім халестэрыну. Страусава ферма з'яўляецца выгаднай інвестыцыяй на слабых землях.

Самка страуса ад трэцяга года жыцця зносіць яйкі — заўсёды між 16 і 18 гадзінай — разам каля 40 у год; адно яйка важыць 1,5 кг., шкарлупіна мае каля 3 мм таўшчыні. Яно прыгоднае для харчавання на працягу паўгода, варыцца яго гадзіну, а наесціся ім можа нават да 10 чалавек. Спажывецкае яйка каштуе 30, расплодавае — 150, а страусяня — 600 злотаў. Сыравінай для прамысловай вытворчасці з'яўляюцца страусавы пёры і скура, напрыклад, кашалёк са страусавай скуры каштуе 500 злотаў.

Міхал Мінцэвіч

Больш талерантнасці

Атрымаў я ад спецыяліста ў Гайнаўскім шпіталі заяву аб прызначэнні артапедычнага абутку. У Беластоку мне заявілі: „Усё гэта атрымаеце, але патрэбна акцэптацыя касы хворых для мундзірных служб. Вы павінны дакументы паслаць заказным лістом у Варшаву і за два тыдні справа аформіцца".

— У мінулым годзе такой валакіты не было, — заяўляю.

— З пачаткам студзеня г.г. адмянілі закон, — адказалі мне.

Нягледзячы на ўзніклыя складанасці, кіраўнік загадаў майстру зняць меру на боты, прычым заявіў: „Як боты будуць гатовы і дашлюць дакументы з Варшавы, патэлефануем, калі прыехаць забіраць абутак". Прыйдзецца чакаць.

Вось як касы хворых ставяцца да інвалідаў. Ды не толькі тыя. Як паказваюць апытанні грамадскай думкі, рэспандэнты заўважаюць, што хворыя ізалююцца грамадскасцю. Усім патрэбна талерантнасць і зразуменне, а ўрад павінен падтрымаць тыя прадпрыемствы, якія даюць працу інвалідам. (ус)

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://republika.pl/niva_bielastok/*
E-mail: *niva_bielastok@poczta.onet.pl* альбо: *niva_bielastok@skrzynka.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2003 r. upływa 5 grudnia 2002 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na I kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Зараз будуць, Сакраце, перці да нас Мілеры, Цімашэвічы, Кваснеўскія...

... і свечкі ставіць ад Дубіч па Міхалова.

Без тылоў ані руш

У мінулым тыдні мядзведзь Сандар Жоржавіч запрасіў на паляну прадстаўнікоў Аб'яднанага ўселяснога маладняку (АУМ).

— Я на гэта маю шмат сіл, каб забяспечыць сваю здаровую пазіцыю, але вы мусіце задбаць пра тылы. Трэба нам яшчэ маладзейшых больш і больш, — пачаў мядзведзь прамову, спаглядаючы на зайца Генадзя, сябра Мядзведжай рады па справах АУМ.

Маладняк з захапленнем глядзеў на пружыністую постаць мядзведзя.

— Немалады ж, а ўсё яшчэ можа, — падумала ў захапленні Сандарам лідэр АУМ рысь Рысь.

— З горада пагражаюць нам самыя адмысловыя плягі: шалее ўрэднасць, сківічны шчым, — працягваў мядзведзь. — Трэба абараняцца. Бярыце прыклад з таварыша Геніка. Што кусцік — там і малы Генік.

Рысь Рысь нясмела кінула вокам на імпазантнае забеспячэнне таварыша зайца, спачываючае вось разам з уласнікам на імху.

— Я ведаю, што не кожны можа, як заяц. Ніколі не будзе зайцам рысь. Праўда, Рысь?

— Ну, — сарамліва прамармытала Рысь.

— Таму час на вучэнні. Мы намовілі перасяліцца ў наш лес сумчатага з далёкіх джунгляў. Нават ва Уладзімірскім лесе не маюць такога сумчатага. А ён ужо ведае, як пазбягацца ўрэднасці, сківічнага шчыму, як дбаць пра тылы. Кожны з нас паміж кадыком а лапкамі ўшые сабе сумачку. Будучыя тылы, так, як сумчаты, будзем кожны там насіць. Да часу, пакуль адпаведная пара не наступіць.

— А калі наступіць? — пасмела спытацца Рысь.

— Вы не чулі? — у свой час! — выручыў Сандара Жоржавіча заяц Генік. — Апошняга даведаецеся на спецвучэнні.

Сустрэча доўга не працягвалася. Аж да змроку чуваць было ва ўсім лесе таямнічыя гукі. Быццам „цык-цык-цык", быццам „сык-сык-сык". А Сандар Жоржавіч засынаў у лагодзе і спакоі. Ведаў: маладняк пачаў сабе шыць торбы. Мядзведзь прыжмурваўся. Уяўляў сабе будучыню: тыл стаяў за кожным дрэвам, за кожным кустом. „Мае тылы. Ва ўсім лесе толькі я і мае тылы. Я і... Я"

Тым часам над лесам бліснуў месяц. Змяя Ссапія і вуж Ззянон у адлеглым узлеску таксама ўкладліся да сну. Падпяваючы старую, забароненую песеньку „Стары мядзведзь моцна спіць..."

МакХолад

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

Вудачнік сядзіць над рэчкаю. Раптам з вады вынырае карова і просіць:

— Пачастуй цыгарэтай!

Аслупянелы вудачнік частуе, карова дзякуе і нырае ў ваду. Вудачнік атупела глядзіць на сабаку. Той азываецца:

— А я што?! Таксама здурэў.

* * *

Старажыла спыталі, што б ён зрабіў, калі б жыццё давялося пачынаць нанава. Старэча падумаў, пачухаў патыліцу:

— Думаю, што зрабіў бы прабор не пасярэдзіне галавы, а збоку.

* * *

— Мамачка, адкуль бяруцца дзеці? — пытае Вова.

— Я неаднойчы табе гаварыла, што бусел прыносіць!

— Ведаю, што бусел. Толькі хто ім прыкідваецца?

* * *

Пасля раскошнай ночы, праведзенай з каханкай, Янка падыходзіць да акна гасцініцы глянуць, ці не ўкралі яму самаход.

— Даражэнькі, — следуе яна за ім, — і самаход твой таксама мізэрны...

* * *

У Расіі задумалі сабраць усе анекдоты і з дапамогаю камп'ютэра стварыць адзін універсальны. Камп'ютэр склаў такі тэкст: „Жонка з каханкам ляжаць у ложку. Раздаецца дзвярны званок. Вова адчыняе, а перад ім Чапаеў з Пецькам — і абодва яўрэі!"

* * *

— Татка! Што гэта такое любоў?

— Гэта выдумка рускіх, каб не плаціць грошай.

* * *

— Мамачка, што гэта такое процізачаткавыя сродкі?

— Гэта нешта, што дазваляе перамяніць небяспечнае месца працы ў зону радасці.

Крыжаванка



Гарызантальна: 3. цвёрды разнаколерны слаісты мінерал, 8. магутны круты віхор, 9. ноша для ахопу рукамі, 10. дзе ён, там і лой, 11. пляцоўка для спектакляў, 13. хлебны соргавы злак з высокім сцяблом (*Sorghum japonicum*), 15. брытанскі знішчальнік перыяду „Бітвы за Англію", 16. дробна парэзаная салома на корм жывёле, 20. народны эпас фінаў і карэлаў, 22. Іван, савецкі генерал, герой „Бітвы за Маскву" (1893-1941), 23. Фрыдрых, прэзідэнт Германіі ў 1919-25 гг., 27. структура цвёрдага рэчыва, абумоўленая характарам размяшчэння яго складовых частак, 29. Эрнеста, лацінаамерыканскі рэвалюцыянер (1928-67), 30. груз вялікай вагі, 31. ансамбль з трох выканаўцаў, 32. сталіца Кубы, 33. турэцкі горад на рацэ Сейхан, 34. возера ў Абхазіі.

Вертыкальна: 1. адкіды, 2. абласны горад між Смаленскам і Арлом, 4. навука пра спадчыннасць, 5. паўночны хваёвы лес, 6. знішчальны агонь, 7. жыхар Чанстаховы, 12. Гіём, французскі паэт (1880-1918), 14. цэнтральнааўстрыйскі горад паблізу пячоры Фрауэнмауэр, 16. глыбокі акоп для скрытага набліжэння да праціўніка, 17. рака ў Бурацыі, якая пасля зліцця з Віцімканам утварае Віцім, 18. порт на поўначы Францыі, 19. міжнародны дагавор, 21. жыхар Айзенэрца (гл. 14 верт.), 24. Матэа, італьянскі паэт (1441-94), 25. конская мова, 26. вялікая рыбалоўная сетка, 27. грузападымальнасць судна, 28. запаленне слізістай абалонкі. (Ш)

Рашэнне крыжаванкі складуць літары з пазначаных курсівам палёў. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца прышлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку з 34 нумара

Гарызантальна: служба, адзежа, курара, Акры, баня, ветлівасць, зара, кава, Арнета, Камчыя, Пархім.

Вертыкальна: слабак, Баку, Адра, жабяня, разліванне, Рывера, бацька, заяўка, Вадзім, арыя, Тапа.

Рашэнне: **Слабыя дзверы не вабяць зладзеяў**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Справа ў росце

— Ты зусім ужо здурэў! — не першы раз выгукнула мне мая каханая Агата, але першы раз, калі справа ў палітыцы. І то ў палітыцы, так сказаць, гміннай. А ўсё з прычыны жартаў.

Справа ў росце. Я думаў, што на такія справы, як выгляд, рост, уяўныя магчымасці кандыдата — звяртаюць увагу толькі жанчыны. Ці ў выбарах на прэзідэнта, ці войта. Як невысокі, то хоць харошы. Як Кваснеўскі ці Цімашэвіч. Бо ці ж няпраўда? Хто найбольш галасоў даў на Беласточчыне на Владзімежа? Хіба ж не камуфляваныя камуністы ды паклоннікі ягонага інтэлекту! Бабы, і беларускі, і полькі, і ўсе іншыя ў нашай ваколіцы і, дарэчы, на светлым захадзе нашае краіны... Або той рост. Хоць, папраўдзе, рост, мабыць, не такі і важны. Аляхоўскі, бачыце, мужчыніска які, а прайграў. Ну, я, вось, і дзякуючы росту падвяргнуўся абвальнай крытыцы мае жонкі. А яна ж не заўсёды хоча браць голас, калі справа ў палітыцы. Ды тут мы пра сваё загаварылі. Хто будзе лепшы кандыдат на прэзідэнта Беластока — Алег ці Антось. Адзін — славутыя два сем, другі — пад тое. Толькі розніца ў вазе, і то не навуковых званняў, а вазе звычайнай. Той другі — больш санавіты. І, мабыць, таго, то вышэй ён, так сказаць, неба і нябесных спраў. У аднаго — рукі як бохны, у другога — больш далікатныя, у абодвух чыстыя... Стаў я перад Агатай абмяркоўваць, а яна аж закіпела:

— Дурны ты, Вандал.

— Чом я дурны! Гэта ж вы, кабеты, навучылі гэтак у палітыцы разбірацца. Можа, не ў палітыцы, а ў палітыках.

— А вы то што? Сам кажаш: Унія працы харошая, бо там тая з доўгімі косамі, як там ёй, Пякарская. Каб тая Пякарская як той Пякарскі на мэнках пакутавала!

Агата сабе красамоўна за свае рудыя кудзеркі аж шарпанула.

— Агата, не твая гэта праблема, што ў пані Касі коса да пояса, а іншых парламентарак ды з іншых груповак. Тым больш, што не пра сейм гаворым, а пра нашы самаўрадавыя выбары...

— Я там і так дам голас на Сакрата. Сакрат харошы. Праўда, дзе той яго чорны чуб, што вожыкам ёжыўся! — у Агаціных вачах бліснула меланхолія.

— Гэта ў сейміку, не ў сейме. А на каго ў гарадской акрузе? — я ўжо амаль што перадвыбарчы аналіз раблю.

— На таго... ну, наймалодшага. Ой, які харошы! У матулю ўдаўся...

— Ды ж Павел апошні ў спіску, думаю, што шанцаў вялікіх не мае...

— Дурны ты! Жанчыны такія: не лічацца ні з логікай, ні сэнсам, сам казаў ты нядаўна. Вось я і дам свой голас на Паўліка. І суседкі таксама.

Я ціха падаўся ў спальню. Тамака ў мяне ў шуфлядзе ляжаць крыху пажоўклыя старыя плакаты: *Возьмем нашы справы ў свае рукі.* Калісьці вісеў той плакацік на сцяне, ды Агата ўсё жартавала, што не пра палітыку ён мне прыгадваў, а пра справы, так сказаць, адпаведныя да месца. І ў іншых паперынах я пакорпаўся, дзе мы ўсё маладыя і поўныя запалу. Вандал Арлянскі

ISSN 0546-1960